

Пасля прыёму гарачай ежы і чаю тэмпература канечнасцяў чалавека павышаецца на 6 градусаў і вышэй, прычым адбываецца гэта не адразу, а праз 30-60 хвілін, а эфект захоўваецца на працягу некалькіх гадзін. СТАР 3



Сабакі разам з салдатамі служаць у войску. Чатырохногія сябры выконваюць тое, што чалавеку часам не па сілах. Своеасаблівая «армія» для сабак — кіналагічны цэнтр, што ў Калодзішчах. СТАР 6



Надыходзячы год звязаны з мудрасцю, інтэлектам, з неабходнасцю прымаць важныя лёсаносныя і стратэгічныя рашэнні. Таму пажадана дзейнічаць пад дэвізам «Сем раз адмерай і адзін раз адрэж». СТАР 8


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 снежня 2012 г. АЎТОРАК № 243 (27358) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ЗАХАВАЦЬ КАМВОЛЬНУЮ ВЫТВОРЧАСЦЬ»

**Прэзідэнт лічыць, што ў Беларусі неабходна захаваць камвольную вытворчасць. Такое меркаванне кіраўнік дзяржавы выказаў учора, наведваючы ААТ «Камволь», перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі яшчэ засталася добрая школа, таму гэту галіну лёгкай прамысловасці неабходна захоўваць.

«Тая краіна мае права на жыццё, якая можа, па-першае, накарміць народ, па-другое, абуць і апрануць. Накарміць, я ўжо гаварыў, мы людзей накармілі, удосталь. Сельская гаспадарка павінна паступова развівацца пры невялікай падтрымцы. Па абутку мы таксама дамовіліся. Нядаўна была нарада па гарбарна-абутковай прамысловасці, мы дамовіліся, як будзем дзейнічаць. Урад павінен далажыць свой пункт гледжання, вынік, на які ён выйшаў. Пакуль гэтага пункту гледжання Кабякоў мне на стол не паклаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў аб недапушчальнасці зрыву тэрмінаў, пастаўленых на нарадзе. Прэзідэнт чакае, што яму будуць прадстаўлены прапановы, дзе будзе аднаўлена перапрацоўка скур, дзе будуць шыцца тыя мільёны пар, якія патрэбны народу.

Развіццё камвольнай вытворчасці ідзе як прадаўжэнне пастаўленых у час Усебеларускага народнага сходу мэт, адзначыў Прэзідэнт. «Гэта адзенне народу патрэбна, без гэтага нельга», — сказаў ён. «Больш таго, кажуць, што вакол ужо ўсё знішчана, толькі Турцыя, Туркменістан і яшчэ нехта вырабляюць тканіны. У Расіі няма такіх вытворчасцяў. Дык чаму б сёння не вырабляць гэтыя тканіны? Нават калі не хапае ўласнай сыравіны, закупляць і прадаваць? Попыт шалёны. Але вельмі дрэнна працуеце», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён таксама зрабіў строгае папярэджанне ўраду. «Вам з Мясніковічам — гэта апошні званок, — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да першага віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашкі. — Мне вашы апраўданні не патрэбны! Я сюды не за апраўданнямі прыехаў. Я добра ведаю, што адбываецца на «Камволі». «Таму расказваць аб тым, якія вы добрыя, мне не трэба. Калі людзі без зарплаты сядзяць, калі людзі ў халодных цэхах працуюць, вы сваякоў, жонку сюды не адправілі працаваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што спецыяльна адкладваў наведванне гэтага прадпрыемства. «Адкладваў, спадзеючыся на тое, што тут штосьці зробяць па сутнасці. Як я пераканаўся, гэта мяне ўразіла: тут нічога не зроблена — як было, так і было», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Як далажылі Прэзідэнту, прадпрыемства знаходзіцца ў глыбокім крызісе. Тэхналагічная адсталасць вытворчасці і зношанасць абсталявання не даюць магчымасці выпускаць прадукцыю канкурэнтаздольную як па якасці, так і па цане. За 10 месяцаў гэтага года чыстая страта склала Br9,5 млрд, рэнтабельнасць — мінус 3,7 працэнта. На 1 лістапада крэдыторская запазычанасць склала Br31,4 млрд, у тым ліку пратэрмінаваная Br21,7 млрд. Крэдыторская запазычанасць і пратэрмінаваная яе частка павялічыліся ў параўнанні з пачаткам года ў 1,7 раза. Сярэдняя заработная плата на прадпрыемстве складае каля Br2 млн, што ў цэлым ніжэй чым па галіне.

«Хапаюць любыя грошы, не думаючы, як будуць вяртаць. Навошта вы іх бераце?» — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да генеральнага дырэктара ААТ «Камволь» Святланы Стрыжак. Як адзначыла кіраўнік прадпрыемства, на гэтыя меры вымушаны ісці, каб нарасціць вытворчасць, утрымаць аб'ёмы, выканаць існуючыя заказы. «Як вы працуеце з пакупнікамі, мне часткова знаёма, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Яны гавораць: барані бог нас звязвацца з Мінскам. Вось, як вы працуеце з пакупнікамі. Я гэта ведаю». «Пры гэтым у Казахстане фабрыка «Бальшавічка» брала ў вас пад дзяржзаказ, ваенным, МНС, тканіны. Вы ім паабяцалі і пасяхова гэта правалілі. І яны вам прад'яўляюць прэтэнзіі. Ужо на ўзровень Прэзідэнта гэта выйшла. Вось як вы працуеце», — дадаў Прэзідэнт.

Як адзначыў першы намеснік старшыні Камітэта дзяржкантролю Леанід Анфімаў, гэта прадпрыемства краіна амаль страціла. Калі ў савецкі час тут выпускалася каля 22 млн пагонных метраў тканін, то сёння толькі 2 млн м. Колькасць работнікаў на прадпрыемстве ў той час складала 7 тыс. чалавек, сёння — менш за тысячу. «Па сутнасці, тут нічога не засталося», — сказаў ён.

Першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка ў сваю чаргу заўважыў, што такая сітуацыя характэрна для ўсіх прадпрыемстваў гэтага профілю. «За гэта прадпрыемства адказвае Русы. Сямашка адказвае за Аршанскі льнокамбінат, мадэрнізацыю яго, а Мясніковіч — за Баранавіцкае ВБА», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Таму мы яшчэ паглядзім, можа, у пачатку наступнага года, што зрабіў Мясніковіч на адказным прадпрыемстве, а вясной, можа, летам, паглядзім ільнокамбінат», — адзначыў Прэзідэнт. «Я не ведаю, як давяраць ураду далей аб'ёмы гэтай работы», — падкрэсліў Прэзідэнт. СТАР 2

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

20 снежня 2012 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца заключнае пасяджэнне першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Песняры беларускай зямлі

# НАШЫ СЭРЦЫ НАПОЎНЕНЫ ІХ ПЕСНЯМІ...

**Творца не знікае з зямлі бясследна... Паэты не пакідаюць нас назаўжды... Але сёлета Янка Купала і Якуб Колас былі ўвесь час побач з намі: 130-ю гадавіну іх нараджэння на працягу цэлага года святкавала ўся краіна.**

**Амаль кожны з нас, як мог, далучыўся да гэтага ўсенароднага юбілею. Магчымасцяў было безліч: па ўсёй краіне, а таксама па-за яе межамі прайшлі маштабныя грамадска-культурныя акцыі, выстаўкі, культурна-адукацыйныя праекты, навуковыя канферэнцыі, літаратурныя конкурсы, прысвечаныя класікам нацыянальнай літаратуры. Урачысты вечар, які днямі адбыўся ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, стаў заключным мерапрыемствам у насычаным на юбілейныя падзеі годзе.** СТАР 2







Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:**

***«Абвяшчэнне наступнага года Годам беражлівасці накладвае адбітак на фарміраванне і выкананне мясцовага бюджэту. Для эфектыўнай работы ўсіх сфер эканомікі важна задзейнічаць усе рэсурсы. Раёны, атрымліваючы дзяржпадтрымку, павінны знаходзіць магчымасць зарабляць грошы. Для гэтага можна задзейнічаць безгаспадарныя землі, накіраваць намаганні на развіццё аграэкатурызму, прыцягненне інвестыцый».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 7° |
| Віцебск | – 14° |
| Гомель | – 14° |
| Гродна | – 10° |
| Магілёў | – 15° |
| Мінск | – 16° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.12.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8540,00 | ▼ |
| Еўра | 11230,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 277,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1053,54 | ▼ |

■ Рэха трагедыі

Васіль БУДКЕВІЧ:

## «Дзеці не павінны дзяжурыць на пераходах, якія не рэгулююцца»

**ТАК сталася, што менавіта ў той дзень, калі ў сталіцы на нараду, прысвечаную прафілактыцы дарожна-транспартнага траўматызму і бяспецы дзяцей на тэрыторыі, прылеглай да ўстаноў адукацыі, сабраліся прадстаўнікі з усіх рэгіёнаў, у Гомелі пад калёсамі смеццявоза загінуў шасцікласнік. У той жа дзень у Гродне васьмігадовы хлопчык вырашыў перабегчы дарогу на чырвонае святло, і хоць кіроўца машыны зрабіў усё, каб пазбегнуць наезду, машына ўсё ж такі зачапіла дзіця. Хлопчык атрымаў траўмы розных ступеняў цяжкасці. Такім чынам, агучаная на нарадзе старшым інспектарам па асаблівых даручэннях упраўлення ДАІ МУС Ганнай Банадык статыстыка атрымала сумны працяг.**

### Пешаход на пераходзе

Па словах Ганны Банадык, за 11 месяцаў гэтага года дзеці сталі ўдзельнікамі 421 дарожна-транспартнага здарэння. 26 непаўналетніх загінулі і 429 атрымалі раненні. У 2011 годзе на дарогах Беларусі загінулі 36 дзяцей. Але апошнія дзесяць гадоў лічбы дарожна-транспартанага траўматызму пастаянна змяншаліся. І калі ў пачатку 2000-х 70 працэнтаў дарожна-транспартных здарэнняў адбываліся па віне дзяцей, то сёння 70 працэнтаў ДТЗ здзяйсняюцца па віне кіроўцаў. СТАР 3

■ Надвор'е

## ТЫДЗЕНЬ СУР'ЁЗНЫХ МАРАЗОЎ

**У мінулыя выхадныя наша краіна трапіла пад уплыў халоднага арктычнага антыцыклону. Таму на працягу ўсяго тыдня на тэрыторыі Беларусі захаваецца халоднае надвор'е, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Пры павышаным фоне атмасфернага ціску па ўсходзе краіны — без істотных ападкаў, аднак па захадзе Беларусі будзе ісці снег, месцамі з завірухамі. Чакаецца халодны паўднёва-ўсходні вецер, парывы якога ў асобных раёнах будуць дасягаць 15—18 м/с. Максімальная тэмпература сёння мінус 12—16 градусаў, толькі па захадзе — 7—11 марозу.

У сераду і чацвер франтальныя раздзелы прынясуць снегапады ў заходні, а 19 снежня — і ў цэнтральны рэгіёны краіны. Будзе анамальна холадна. Уначы чакаецца мінус 10—17 градусаў, а па паўночным усходзе да 18—22 марозу; удзень — мінус 10—15 градусаў. Толькі па паўднёвым захадзе краіны тэмпературны фон на працягу сутак будзе ў межах мінус 6—9 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, напрыканцы тыдня захаваецца марознае надвор'е. У пятніцу месцамі па краіне, а 22 і 23 снежня ўжо паўсюдна будзе ісці кароткачасовы снег і слабая мяцеліца. Уначы мінус 10—17 градусаў, пры праясненнях да 18—20 марозу, удзень — 8—15 градусаў ніжэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Дапамога

## ВЫРАТАВАНЫЯ СА СНЕЖНАГА ПАЛОНУ

**Толькі за адны суткі работнікі МНС прыйшлі на дапамогу кіроўцам 140 транспартных сродкаў, якія захраслі ў снежных заносах.**

На тэрыторыі Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей выратавальнікі 113 разоў аказвалі дапамогу ў дастаўленні з сумётаў легкавых і грузавых аўтамабіляў, рэйсавых аўтобусаў, аўтамабіляў хуткай медыцынскай дапамогі, у якіх знаходзіліся 425 чалавек, у тым ліку 26 дзяцей.

Так, увечары паміж вёскамі Раманы і Варонча Карэліцкага раёна ў выніку снежных заносаў засеў рэйсавы аўтобус. У ім было 10 пасажыраў, адно з якіх была цяжарная жанчына. У гэты ж дзень каля вёскі Кірвелі Іўеўскага раёна аўтобус з'ехаў у кювет. Кіроўца, едучы з вёскі Гальшаны Ашмянскага раёна ў сталіцу, збіўся з маршруту і няправільна збочыў на прасёлкавую дарогу. Зразумеўшы памылку, пачаў разварочвацца і з'ехаў у кювет. На момант прыбыцця падраздзяленняў МНС у салоне знаходзіліся 44 чалавекі.

У Салігорскім раёне выратавальнікі дасталі з гурбаў на ўзбочыне дарогі аўтамабіль хуткай медыцынскай дапамогі. У Нясвіжскім раёне ў заснежаны кювет з'ехаў мікрааўтобус, у салоне якога былі восем пасажыраў. Як паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, пацярпелых не было. Вядзецца пастаянны маніторынг дарожнай сітуацыі ў неспрыяльных умовах надвор'я. МНС заклікае кіроўцаў улічваць складаную абстаноўку на дарогах. Калі ж паездка на далёкія адлегласці непазбежная, трэба не толькі правільна выбіраць хуткасны рэжым, але і прыходзіць на дапамогу іншым удзельнікам дарожнага руху, якія трапілі ў цяжкае становішча.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ДЭПАРДЗЬЕ АДМОВІЎСЯ АД ФРАНЦУЗСКАГА ГРАМАДЗЯНСТВА

Славуты акцёр Жэрар Дэпардзье адмовіўся ад французскага грамадзянства. Пра гэта ён сам заявіў у адкрытым лісце на імя прэм'ер-міністра краіны Жан-Марка Эро, апублікаваным у газеце Le Journal du Dimanche. Акцёр адзначыў, што плаціць падаткі з 14 гадоў і, паводле яго слоў, заплаціў за 45 гадоў працоўнай дзейнасці 145 млн еўра падаткаў. Крыху раней акцёр з'ехаў жыць у Бельгію, прадаўшы свой парыжскі дом, і зарэгістраваўся ў бельгійскай вёсцы Нешэн, паведаміўшы пра намер плаціць падаткі па месцы жыхарства. Гэта выклікала абурэнне дзейных французскіх улад, прэм'ер Жан-Марк Эро назваў гэты ўчынак непатрыятычным і «вартым жалю». У адказ Дэпардзье аддаў свой пашпарт, а таксама адмовіўся ад сацыяльнага страхавання. Дэпардзье — не першы



заможны француз, які вырашыў перабрацца ў Бельгію, каб пазбегнуць выплаты падатковых збораў. Французскія ўлады па ініцыятыве прэзідэнта-сацыяліста Франсуа Аланда маюць намер у 2013 годзе ўвесці ў краіне «падатак для багатых» — фіскальную норму ў 75% стаўкі гадавога даходу, які перавышае 1 млн еўра.

### ДЗЯЎЧЫНКА НАРАДЗІЛАСЯ 12.12.12 У 12:12

У Бостане (штат Масачусетс, ЗША) 12 снежня 2012 года ў 12 гадзін 12 хвілін па мясцовым часе ў Галоўнай гарадской бальніцы нарадзілася дзяўчынка. Працэс родаў у яе маці Колін Клінкер доўжыўся таксама каля дванаццаці гадзін. «Гэта ўнікальны выпадак у нашай медыцынскай практыцы, калі дата і час нараджэння супадаюць такім цудоўным чынам», — заявіў прадстаўнік бальніцы. Шчаслівыя бацькі назвалі дзіця Наэль Джой. «Нараджэнне малой, ды яшчэ пры магічным збегу камбінацыі, якая складаецца з лічбы дванаццаць, мы лічым блаславеннем Божым. Тым больш што летась пры родах мы страцілі нашу першую дачку», — цытуюць СМІ бацьку дзяўчынкі, афіцэра Берагавой аховы ЗША Джо Клінкера.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### КРЫВАВАЯ ПЯТНІЦА Ў ЗША



У Злучаных Штатах Амерыкі здарыўся сапраўдны кашмар: раніцай у пятніцу па мясцовым часе (увечары па беларускім) у выніку стральбы, адкрытай сынам адной з настаўніц пачатковай школы ў Канэктыкуце, загінулі 26 чалавек. 20 з іх былі дзецьмі, многім з якіх было не больш за пяць гадоў. Сярод ахвяр стралка апынулася і яго маці, якую ён забіў яшчэ дома. Сам злачынец скончыў самагубствам. Якія былі яго матывы, пакуль невядома. Масавае забойства, якое стала адным з самых крывавых за ўсю гісторыю ЗША, адбылося ў школе «Сэндзі Хук» у горадзе Ньютаўн, штат Канектыкут. Забойцам аказаўся 20-гадовы Адам Лэнза. Як распавялі аднакласнікі Лэнзы, ён добра вучыўся, аднак увесь час знаходзіўся ў трывожным стане, ні з кім не сябраваў і ў асноўным любіў заставацца сам-насам. Былі выказаны здагадкі, што Лэнза мог пакутаваць на лёгкую форму аўтызму, але пацвярджэння гэтаму не знайшлося.

Стральба ў школе прывяла Ньютаўн і ўсю астатнюю краіну ў стан шоку. З прамовай у Белым доме выступіў прэзідэнт ЗША Барак Абама, які хоць і гаварыў спакойна, рабіў доўгія паўзы і раз-пораз выціраў слёзы. У краіне абвешчана чатырохдзённая жалоба, на афіцыйных установах прыспусцілі сцягі. 16 снежня прэзідэнт прыбыў у Ньютаўн, каб выказаць спачуванні сваякам загінулых і прыняць удзел у жалобнай імшы. Здарэнне чакана выклікала ўсплёск крытыкі на адрас урада з боку праціўнікаў свабоднага



продажу зброі. Папярэдняе параўнальнае па маштабе злачынства было здзейснена ў ліпені гэтага года ў горадзе Аўрора, штат Каларада, калі падчас прэм'еры фільма пра Бэтмэна мясцовы жыхар Джэймс Холмс адкрыў стральбу ў кінатэатры, забіўшы 12 чалавек і параніўшы амаль 60.

## Дзевяноста гадоў таму — 30 снежня 1922 года — быў створаны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. А 25 снежня 1991 года ён спыніў сваё існаванне. Што значыў ці, магчыма, і цяпер значыць для вас СССР?

**Зоя ПАЎЛЮЧЭНКА, Ленінградская вобласць, дыспетчар аўтапарка:**



— Для мяне сацыялізм — гэта час павальнага дэфіцыту, чэргі літаральна на ўсё — кансерваваны гарошак, маянэз, апельсіны, мандарыны, мяса, рыбу, імпартнае адзенне. Чаго ж, здавалася, не хапае нам у сённяшняй дэмакратычнай Расіі? З гэтай нагоды згадваю выпадак, які перавярнуў усю свядомасць. Аднойчы ў аўтобус, у якім ехала, зайшла кантралёр. Побач са мной сядзела згорбленая бабулька, у якой не аказалася грошай, каб аплаціць праезд. Дагледжаная, гладкая маладзіца так абразіла старую, што ў той выступілі слёзы на вачах: «Дзеткі я ўсё жыццё аддала заводу, працавала на гэтую дзяржаву, дык няўжо не заслужыла людскіх адносін да сябе?» Але пасажыры абыякава адварочваліся ад яе. І тады я зразумела: як бы ні ацэньвалі цяпер савецкі лад, але ён быў больш чалавечны, людзі нават у самыя цяжкія часы захоўвалі чалавечую годнасць, гатовы былі прыйсці на дапамогу. Не было культу грошай, не лічылася нечым ганебным перахапіць у суседа «пяцёрку» да зарплаты. Нармальнай з'явай тады лічылася ўсё, што цяпер здаецца непрымальным: любоў да Радзімы, павага да чалавека працы, імкненне да ведаў, жаданне прыносіць карысць сваёй краіне. А вялікая савецкая культура сапраўды выхоўвала ў людзях чалавечнасць, жаданне да самаўдасканалення.

**Ала КАЗЛОВА, г. Баранавічы, пенсіянерка:**



— У маім жыцці Савецкі Саюз шмат што значыць, менавіта з савецкім перыядам звязаны лепшыя ўспаміны. Дзяцінства, школьныя гады, прыём у акцябраты, а затым у піянеры. Помню, дамоў ляцела як на крылах, калі стала піянеркай, і нават расшпіліла паліто, каб усе бачылі чырвоны гальштук.

За час работы экскурсаводам аб'ездзіла ўсю краіну, і ўсюды да нас ставіліся вельмі добра, гасцінна і ветліва. Калісьці мы жылі адной дружнай сям'ёй. У мяне засталося шмат знаёмых і сяброў цяпер ужо ў суверэнных краінах на постсавецкай прасторы. Бясспрэчна, хацелася б з імі сустрэцца, пагутарыць па душах, даведацца, як ім жывецца. Але ж, па-першае, няма матэрыяльнай магчымасці, а па-другое, нас раз'ядноўваюць межы, мытні, візы...

**Алена ПАПЛАЎСКАЯ, г. Мінск, прэс-сакратар упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама:**



— Што для мяне Савецкі Саюз? Многае. Гэта і словы цудоўнай песні, дзе ёсць такія радкі: «Мой адрас — Савецкі Саюз». Гэта і вядомы значок з Ільічом на грудзях.

А колькі слёз было праліта, што не ўвайшла ў першую пяцёрку лепшых піянераў — не хапіла ўзросту. І гэтае імкненне, закладзенае піянерскай і камсамольскай арганізацыямі — быць заўсёды наперадзе, удасканальвацца, не баяцца цяжкасцяў, выстаяць і перамагчы — застаецца са мной у жыцці. Ды і людзі былі больш душэўнымі, адкрытымі. Сама атмасфера таго часу была насычана адчуваннем пастаянства і спакою. А ў памяці зноў усплываюць захапляльная дваровая гульня ў выбівалы, піянерскія песні каля вогнішча, збор макулатуры для таго, каб мець магчымасць набыць кнігі любімага класіка, першыя красоўкі «Адзідас», штроксы ці джынсы. Цяпер бы «машыну часу» — і ў слаўнае мінулае.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# «ЗАХАВАЦЬ КАМВОЛЬНУЮ ВЫТВОРЧАСЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання ААТ «Камволь» звольніў кіраўніка гэтага прадпрыемства Святлану Стрыжак, старшыню канцэрна «Беллегпрам» Генадзя Вырко і яго намесніка Андрэя Мытніка. Прэзідэнт паставіў на чале прадпрыемства «Камволь» яго галоўнага інжынера Віктара Гаўрыленку. Кіраўнік дзяржавы таксама даручыў да новага года ўнесці прапановы па кандыдатуры новага кіраўніка канцэрна «Беллегпрам».

«Тое, што я тут убачыў, — гэта злачынная безадказнасць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Ну як жа так: разбітыя шыбы і жанчыны працуюць?! Тут і Ладуцька хадзіў, і Сямашка, і Мясніковіч. Гэта злачынства! І за гэта трэба прыцягнуць да адказнасці».

Звяртаючыся да Віктара Гаўрыленкі, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта яго шанц аднавіць прадпрыемства. «Не зробіш — пасаджу! Выбачай, што я так гавару, але выбару няма. Але я не хачу, каб ты сядзеў. Ты мне патрэбны тут як дырэктар, і ты павінен зрабіць гэта прадпрыемства, павінен па-гаспадарску разабрацца, як будзе ісці мадэрнізацыя», — сказаў Прэзідэнт.

На прадпрыемстве прысутнічаў таксама яго былы кіраўнік, а цяпер намеснік старшыні канцэрна «Беллегпрам» Андрэй Мытнік. «Вы давялі прадпрыемства да ручкі? — звярнуўся да яго Аляксандр Лукашэнка. — Вы ведаеце, што пра вас гавораць у вашым канцэрне? Навошта яго сюды ўзялі? Ён жа не прымае ніякіх рашэнняў! Ніякіх! І перашкаджае іншым працаваць. У яго рукі дрыжаць, ён баіцца ўсіх, а сваім падначаленым забараняе да кіраўніка заходзіць нават: не лезьце, не ідзіце. Ён нават не чытае дакументы, просіць сваіх падначаленых: вы мне птушачкі пастаўце, дзе я павінен прачытаць. Вы гэта ведаеце?».

«Кіраўніка канцэрна і былога дырэктара, які праваліў тут усё, і якога ён сабе намеснікам узяў, — выгнаць з работы да вечара. І да новага года ўнесці прапановы па назначэнні кіраўніка «Беллегпрама», — сказаў Прэзідэнт. «Не надумайцеся яшчэ назначыць лодара якога выконваючым на гэты час, інакш пойдзе Кабякоў сюды працаваць», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Але ён стаў такім міністрам (кіраўнік канцэрна. — **Заўвага БЕЛТА**), што да яго нават людзі не могуць зайсці, якія хочуць штосьці сказаць. Гэта я ведаю дакладна. Ён узяў старога дырэктара, які давёў да ручкі прадпрыемства, і пасадзіў сабе намеснікам. Праўда, і новы дырэктар нічога не зрабіла. Абуральнае стаўленне да людзей!» — адзначыў Прэзідэнт.

«І паглядзіце дасканала на гэты канцэрн. Там трэба чыстку, напэўна, правесці значную. Але там ёсць і добрыя людзі, якія хочуць працаваць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўжо будучая зіма павінна стаць для працуючых на прадпрыемстве людзей у радасць. Прэзідэнт таксама даручыў стварыць нармальныя ўмовы для работы ўжо з сённяшняга дня. «Трэба цяпер працуючых людзей абараніць. Падумайце, як гэта зрабіць, але неадкладна рабіце, каб людзям было нармальна працаваць, можа быць, пастаўце на рабочых месцах якія-небудзь лёгкія, не затратныя ўцяпляльнікі, але стварыце нармальную абстаноўку для людзей», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка паразмаўляў з работнікамі прадпрыемства і паабяцаў, што ААТ «Камволь» будзе адноўлена. «Прадпрыемства мы зробім, я вам абяцаю, да наступнай зімы, — сказаў Прэзідэнт. — Або адновім гэта, або зробім новае. Але я больш прытрымліваюся таго, каб аднавіць гэта».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб другой канцэптуальнай рэчы — неабходнасці дыверсіфікацыі эканомікі, арыентацыі яе на мясцовую сыравіну. Прэзідэнт лічыць, што ў Беларусі неабходна развіваць авечкагадоўлю, каб мець уласную сыравіну для камвольнай вытворчасці. Ён нагадаў, што ў Віцебскай вобласці сёння ўжо будуецца 21 авечкагадоўчая ферма. «Мы развядзём авечак, атрымаем воўну, а астатняе дазакупім на знешніх рынках. А калі будзе вялікі попыт — масава можам купляць на знешнім рынку воўну і выраблять цудоўныя тканіны, якія тут умеюць рабіць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Такім чынам, мы прадаўжаем дыверсіфікацыю эканомікі, прывязваемся да сваёй сыравіны і вырабляем тут тканіну. Гэта цэлая галіна лёгкай прамысловасці. Вось у чым сэнс усёй гэтай рэканструкцыі — Аршанскага, Баранавіцкага і Мінскага прадпрыемстваў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Мы можам рабіць цудоўныя тканіны. Людзі ёсць, школа ёсць, сыравіны пакуль не хапае, але яе шмат на міжнародных рынках можна купіць. Мы павінны сваю сыравіну мець. І гэта мы павінны зрабіць на працягу гэтай пяцігодкі», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

# НАШЫ СЭРЦЫ НАПОЎНЕНЫ ІХ ПЕСНЯМІ...



Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Гэтыя даты далі нам магчымасць з адлегласці ў больш чым стагоддзе яшчэ раз асэнсаваць значэнне для беларускай і сусветнай культуры асоб песняроў і іх творчасць, — зазначыў **міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ**. — Яны намагаліся ўзняць беларускую літаратуру на ўзровень лепшых еўрапейскіх і сусветных узораў, надаць беларускаму слову ёмістасць найвышэйшых дасягненняў паэтыкі, філасофскай грамадска-палітычнай думкі. Сёння мы можам з упэўненасцю сказаць, што яны сваёй мэты дасягнулі.

Сярод найбольш буйных мерапрыемстваў, прысвечаных 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, неабходна адзначыць грамадска-культурныя акцыі «Чытаем Купалу разам», «Мы чытаем Коласа», урачыстыя цырымоніі ўскладання кветак ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Янку Купалу ў парку яго імя і да помніка Якубу Коласу на аднайменнай плошчы ў Мінску. Нельга не ўзгадаць святы — Рэспубліканскае свята паэзіі, песні і народных рамёстваў «З адною думкаю аб шчасці Беларусі...» і Рэспубліканскае свята паэзіі «О, Беларусь, ты сэрца і душа», якія прайшлі на высокім узроўні з удзелам вядомых беларускіх пісьменнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва, вядучых прафесійных і аўтарскіх калектываў краіны ў Маладзечанскім і Стаўбцоўскім раёнах.



— Досыць цёплыя сустрэчы адбыліся ў сельскай мясцовасці, дзе моладзь не перанасычана інфармацыяй, — узгадаў **малодшы сын Якуба Коласа Міхась МІЦКЕВІЧ**. — Асабліва ўрачыста і цёпла яны прайшлі ў Ганцавічах і ў Люсіне, там, дзе некалі Колас пачынаў выкладчыцкую справу. Увогуле, год быў багаты на падзеі ў літаратурным жыцці. У Міхася Мушынскага выйшла кніга «Жыццяпіс Коласа», завяршаецца выданне 20-томнага зборніка твораў Коласа, Мікола Маляўка выпусціў цудоўную кніжачку для школьнікаў «Коласаў абярэг», добрую кнігу напісаў Дзмітрый Дземідовіч, выйшлі два тамы «Янка Купала і Якуб Колас». Вельмі важнай падзеяй стаў выхад у свет «Арфаграфічнага слоўніка беларускай мовы», які налічвае больш за 230 тысяч слоў. Гэта каласальнае багацце!

Толькі і гэта яшчэ не ўсё. Міністэрствам культуры пры падтрымцы Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА падрыхтаваны і выдадзены каталог «Аўтографы першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Каталог». Дзяржаўным выдавецтвам «Мастацкая літаратура» выдадзены факсімільныя выданні «Шляхам жыцця» Я. Купалы і «Сымон-музыка» Я. Коласа, а таксама выданні, прысвечаныя песнярам, у серыях «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» і «Школьная бібліятэка». Фотаальбом да юбілеяў пісьменнікаў на беларускай і англійскай мовах убачыў свет у выдавецтве «Беларусь».

— Творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа ўвабрала ў сябе лепшыя ўзоры жывой беларускай мовы і літаратуры, мае вялікі патэнцыял для яе папулярызацыі ў свеце, — падкрэсліў міністр культуры. — Літаратурныя творы нашых песняроў перакладзены амаль на 100 замежных моў. Колькасць выдадзеных твораў налічвае дзясяткі мільёнаў паасобнікаў. Імёнамі беларускіх класікаў названы вуліцы, плошчы, школы, караблі, тэатры, бібліятэкі, навучальныя ўстановы. І не толькі ў Беларусі, а і ў Літве, Польшчы, Расіі, Амерыцы, Бразіліі, Ізраілі, ва Узбекістане і Францыі.

Разам з беларусамі юбілеі Купалы і Коласа святкавалі амаль ва ўсім свеце. Міжнародныя выставачныя праекты з поспехам былі рэалізаваны ў Арменіі, Балгарыі, Бельгіі, Славакіі, Літве, Польшчы, Расіі, на Украіне.

— У верасні — кастрычніку ў Доме нацыянальнасці Санкт-Пецярбурга прайшла выстава «Фотаэкспазіцыя музея Якуба Коласа», якая была арганізавана Домам нацыянальнасці, Беларуска-расійскім братэрствам, Беларускай нацыянальнай культурнай аўтаноміяй і Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа, — расказаў **намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Беларуска-расійскае братэрства», член Саюза пісьменнікаў Расіі Андрэй АНТОНАЎ**. — Выстава выклікала цікавасць у пецярбуржцаў. Магчыма, таму, што руская і беларуская літаратура надзвычай блізкія. Мы фактычна адзіны народ, аб чым, па сутнасці, і кажа ў сваёй творчасці Колас. Ён вязаў і садзейнічаў узаемапранікненню беларускай і рускай культур. Невыпадкова чуў такое выказванне, што творы пісьменніка па духу блізкія творам рускіх класікаў.

Надзвычай прыемна было пачуць з вуснаў расійскага госця вядомыя коласаўскія радкі «Мой родны кут, як ты мне мілы...» У той вечар класікаў беларускай літаратуры цытавалі рэдактар часопіса «Полымя» Мікола Мятліцкі, народны артыст Беларусі Генадзь Аўсяннікаў; бы сам Колас, выступіў Міхась Канстанціновіч. А галоўны дырэктар радыёстанцыі «Беларусь» Наум Гальпяровіч прысвяціў Коласу асабісты верш. Бы запавет, чыталі беларускіх песняроў дзеці — удзельнікі аматарскага заслужанага калектыву «Равеснік» і зямлячка Коласа — Уладзіслава Грэкава. Дарэчы, дзядуля дзяўчынкі — Анатоль Васільевіч Грэкаў, былы начальнік аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама, які шмат гадоў узначальваў дабрачынны савет Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа — шмат чаго зрабіў дзеля ўшанавання народнага паэта. На жаль, нядаўна яго не стала.

У межах работ па добраўпарадкаванні тэрыторый гісторыка-культурных аб'ектаў, звязаных з жыццём і творчасцю Янкі Купалы, праведзены бягучы рамонт і добраўпарадкаванне філіяла Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы — «Акопы» і «Ляўкі», здзейснены бягучы рамонт будынка музея ў Мінску. Урачыста адкрыта першая чарга новай экспазіцыі музея, якая дазваляе на якасна новым узроўні паказаць жыццё і творчасць паэта ў нацыянальным, еўрапейскім і сусветным кантэксце. У Ізраілі па ініцыятыве Пасольства Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы нададзена плошчы ў горадзе Ашдод, дзе пражывае звыш 200 тыс. нашых суайчыннікаў.

З мэтай добраўпарадкавання тэрыторый гісторыка-культурных аб'ектаў, звязаных з жыццём і творчасцю Якуба Коласа, зроблены капітальны рамонт і рэстаўрацыя фасадаў будынка Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа ў сталіцы і праведзены работы па рэканструкцыі мемарыяльнай сядзібы паэта. Таксама адбыліся рамонтныя работы на мемарыяльных аб'ектах філіяла музея ў Акінчыцах, Альбуці, Смольні, Ластку (Стаўбцоўскі раён).

Ушанаванне памяці песняроў Беларусі сёлета было надзвычай маштабным. Кожны, хто хацеў, зрабіў свой унёсак у агульную справу. Найбольш актыўныя з рук міністра культуры атрымалі падзячныя лісты ад намесніка прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоля Тозіка, старшыні аргкамітэта па святкаванні 130-годдзя з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі.

Старшыня Стаўбцоўскага райвыканкама Уладзімір Місько — «За ўшанаванне памяці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа на радзіме песняра ў Стаўбцоўскім раёне». Дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльна-літаратурнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская — «За актыўную папулярызацыю творчасці народнага паэта Беларусі». Дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч — «За актыўную папулярызацыю творчасці народнага паэта Беларусі». Прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мушынскі — «За значны ўклад у навукова-даследчую работу па вывучэнні творчай і жыццёвай спадчыны народнага паэта Беларусі Якуба Коласа». Намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Беларуска-расійскае братэрства», член Саюза пісьменнікаў Расіі Андрэй Антонаў — «За актыўную папулярызацыю творчасці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа ў горадзе Санкт-Пецярбургу. За ўмацаванне літаратурных беларуска-расійскіх сувязяў». Дырэктар Літаратурна-мемарыяльнага музея Аляксандра Пушкіна Таццяна Міхнёва — «За беражлівае захаванне музейных прадметаў, звязаных з гісторыяй сям'і народнага паэта Беларусі Якуба Коласа ў фондах Літаратурнага музея Пушкіна ў Вільнюсе. За актыўную папулярызацыю творчасці Якуба Коласа сярод жыхароў Рэспублікі Літва». Начальнік аддзела культуры Маладзечанскага райвыканкама Аляксандр Рамановіч — «За ўшанаванне памяці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы на радзіме песняра ў Маладзечанскім раёне». Дырэктар Музея Янкі Купалы ў Пячышчах (Рэспубліка Татарстан) Рыма Абызава таксама была ўзнагароджана падзячным лістом.

— Магутны прыродны талент, велізарная працавітасць, змястоўная прага літаратурнага самаўдасканалення зрабіла нашых нацыянальных геніяў — Янку Купалу і Якуба Коласа — сусветна вядомымі мастакамі слова, чыя творчасць, як непераўзыдзены ўзор высокага мастацтва, з'яўляецца і застанецца духоўным сімвалам Беларусі, — перакананы Барыс Святлоў. — Чытайце і перачытвайце класікаў! І вы ўзбагаціце сваю душу прыгажосцю, напоўніце яе гармоніяй, наталіце смагу пяшчотай і дабрынёй, адчуеце асалоду ад беларускіх краявідаў, мацней і кранальней палюбіце сваю Айчыну, убачыце яе вачыма Купалы і Коласа! А нашы душы і сэрцы, напоўненыя іх словамі і песнямі, — лепшыя помнікі ім.

Як дадаў міністр культуры, год заканчваецца, але ж святы і падзеі, звязаныя з імёнамі Янкі Купалы і Якуба Коласа, працягваюцца. У наступным годзе плануецца адкрыццё мемарыяльных дошак Купалу і Коласу ў Вільні, мемарыяльнай дошкі Янку Купалу ў Рызе. Нас чакае і шэраг цікавых мерапрыемстваў!

**Вераніка КАНЮТА.**

# У ГОНАР ВЕТЭРАНАЎ КДБ

**НАПЯРЭДАДНІ 95-годдзя з дня ўтварэння органаў дзяржаўнай бяспекі ў Мінску прайшло ўрачыстае адкрыццё скульптурнай кампазіцыі, прысвечанай памяці супрацоўнікаў КДБ, што загінулі пры выкананні баявых заданняў і службовага абавязку.**

Скульптурная кампазіцыя ўстаноўлена на тэрыторыі Інстытута нацыянальнай бяспекі. І гэта невыпадкова: ад часу пачатку працы папярэдніка інстытута — Вышэйшай школы КДБ СССР — у Мінску з 1961 года яе скончылі дзясяткі тысяч афіцэраў, многія з якіх і сёння нясуць службу і ў нашай краіне, і ва ўсіх астатніх рэспубліках СНД. Сярод найбольш вядомых выпускнікоў — Сакратар Савета бяспекі Расійскай Федэрацыі Мікалай Патрушаў, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Сяргей Іваноў.

Таму на цырымонію адкрыцця ў Мінск прыехалі прадстаўнікі спецслужбаў некаторых краін СНД і іх ветэранскіх арганізацый. Дырэктар ФСБ Расійскай Федэрацыі генерал арміі Аляксандр Бортнікаў, выступаючы там, адзначыў паважлівае стаўленне ў Беларусі да памяці загінулых чэкістаў. Сакратар Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў у сваім выступленні падкрэсліў: адкрыццё помніка — гэта не проста мерапрыемства да якойсьці даты, а частка дзяржаўнай палітыкі. І сёння вельмі важна берагчы памяць аб палеглых супрацоўніках органаў бяспекі ў мэтах выхавання новага пакалення. Ветэран КДБ Іван Леапольдавіч Лысакоўскі, які аддаў службе ў КДБ больш чым паўвека, усхвалявана дзякаваў за ўвагу да памяці тых, хто самаадданa служыў і пры неабходнасці ахвяраваў сабой без развагі — дзеля бяспекі Радзімы.

Устаноўленая ў Інстытуце нацыянальнай бяспекі скульптурная кампазіцыя адліта з бронзы. Сродкі на яе ўзвядзенне былі ахвяраваны супрацоўнікамі КДБ Беларусі, ветэранскімі арганізацыямі Дзяржпагранкамітэта, афіцэрамі службаў бяспекі Казахстана, Арменіі і Азербайджана.



Памятнік разведчыкам і контрразведчыкам, што загінулі, — гэта апошняя праца вядомага беларускага скульптара, ветэрана вайны ў Афганістане Уладзіміра Жбанава, якую той не паспеў закончыць, пайшоўшы з жыцця. Але яго справу давёў да канца вучань майстра — Яраслаў Філіповіч.

**Наш кар.**

# НОВЫЯ АРЫЕНЦІРЫ КАЗАХСТАНА



**14 снежня 2012 года народу Казахстана было прадстаўлена Пасланне Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан. Пасланне стала эпахальным, бо ў час яго была агучана новая стратэгія палітычнага развіцця краіны — «Казахстан-2050».**

Як было адзначана Нурсултанам Назарбаевым, папярэднія 15 гадоў краіна развівалася ў кірунку Стратэгіі развіцця Казахстана да 2030 года, але час змяніўся, і, каб яму адпавядаць, краіне патрэбна новая стратэгія. Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што шэраг палажэнняў былой стратэгіі ўдалося выканаць датэрмінова. Ён таксама прывёў шэраг уражальных прыкладаў таго, чаго ўдалося дабіцца за папярэднія 15 гадоў.

Краіне ўдалося дабіцца вырашэння ўсіх патэнцыяльных тэрытарыяльных праблем з суседзямі, дэлімітаваўшы ўсе 14 тысяч кіламетраў дзяржаўнай мяжы. Унутрыпалітычную стабільнасць і нацыянальнае адзінства, адзначыў Прэзідэнт, удалося ўмацаваць на аснове шматпартыйнасці і развіцця грамадзянскай супольнасці. У прыватнасці, ім былі названы наступныя лічбы: «Працуе звыш 18 тысяч НВА самай рознай накіраванасці. Выходзіць каля 2,5 тысячы СМІ, каля 90% з іх — прыватныя».

У галіне эканамічнага развіцця Прэзідэнт адзначыў наступныя дасягненні: за 15 гадоў аб'ём нацыянальнай эканомікі ўзрос з 1,7 трыльёна тэнге ў 1997 годзе да 28 трыльёнаў тэнге ў 2011-м; ВУП на душу насельніцтва ўзрос больш чым у 7 разоў; дабіліся росту знешняга гандлю ў 12 разоў, а аб'ёмаў вытворчасці прамысловай прадукцыі — у 20 разоў, здабыча нафты павялічылася ў 3 разы, прыроднага газу — у 5 разоў.

У сацыяльнай сферы за названы перыяд таксама ўдалося дабіцца многага. Як сказаў Нурсултан Назарбаеў: «З 1997 года па ўсёй рэспубліцы пабудавана 942 школы, а таксама 758 бальніц і іншых аб'ектаў аховы здароўя». Таксама ён адзначыў, што колькасць насельніцтва павялічылася з 14 амаль да 17 мільёнаў чалавек, а працягласць жыцця ўзрасла да 70 гадоў. Сур'ёзныя поспехі відавочныя і ў развіцці інфраструктуры. Паводле слоў Прэзідэнта, «пабудавана і рэканструявана больш за 48 тысяч кіламетраў дарог агульнага карыстання, а таксама 1100 кіламетраў чыгункі».

З улікам новых глабальных выклікаў, стратэгія Казахстана да 2050 года змяшчае і новыя адказы на іх. Паводле слоў Нурсултана Назарбаева, «галоўная мэта — да 2050 года ўвайсці ў лік 30-ці самых развітых дзяржаў свету». У якасці эканамічнай палітыкі новага курсу прыняты ўсёабдымны эканамічны прагматызм на прынцыпах прыбытковасці, вяртання ад інвестыцый і канкурэнтаздольнасці. Прэзідэнт чакае, што ўсе без выключэння эканамічныя і кіраўніцкія рашэнні будуць прымацца з пункту гледжання эканамічнай мэтазгоднасці і доўгатэрміновых інтарэсаў, будзе весціся пошук новых рынкавых ніш, дзе Казахстан зможа ўдзельнічаць у якасці бізнэс-партнёра, узяты арыенцір на стварэнне спрыяльнага інвестыцыйнага клімату з мэтай нарошчвання эканамічнага патэнцыялу, створаны эфектыўны прыватны сектар эканомікі і развіта дзяржаўна-прыватнае партнёрства.

**Краіна павінна працаваць як адзіная карпарацыя, а дзяржава павінна быць яе ядром.**

У галіне кадравай палітыкі будзе ўведзена новая практыка — прыцягненне знешняга кадравага рэсурсу праз праграмы аўтсорсінгу, што дазволіць адначасова правесці і перанавучанне айчынных кадраў. У галіне бюджэтнай палітыкі арыенцірам з'яўляецца скарачэнне дэфіцыту да максімальна магчымага мінімуму і факусіроўка на прадукцыйных з пункту гледжання доўгатэрміновай перспектывы агульнанацыянальных праектах. У сферы падатковай палітыкі будзе працягнута палітыка лібералізацыі падатковага і сістэматызацыі мытнага адміністравання, праводзіцца работа па спрашчэнні і мінімізацыі падатковай справаздачнасці, будзе ўзяты ўхіл на сацыяльную накіраванасць.

Адным з ключавых фактараў поспеху стане канцэнтрацыя на інфраструктуры. Пры дапамозе спецыяльнай праграмы «Глабальная інфраструктурная інтэграцыя» Казахстан плануе стварыць сумесныя прадпрыемствы па ўсім свеце, якія будуць кіраваць вытворчымі транспартна-лагістычнымі аб'ектамі. Амбіцыйныя задачы ставяцца па развіцці транзітнага патэнцыялу — да 2050 года транзітныя перавозкі праз Казахстан павінны павялічыцца ў дзесяць разоў. Ключавой задачай з'яўляецца прасоўванне казахстанскага экспарту толькі на тыя рынкі, дзе будзе доўгатэрміновы попыт на прадукцыю краіны.

Цікавай асабіста для мяне стала аб'яўленая задача па мадэрнізацыі сістэмы кіравання дзяржаўнымі актывамі з выкарыстаннем карпаратыўнага вопыту. У 2009 годзе я прапаноўваў канцэпцыю развіцця Беларусі на аснове падобнай аналогіі, ведучы размову пра «ТНК Беларусь» — адну з першых у свеце дзяржаўна-транснацыянальных карпарацый, якія выкарыстоўваюць зладжанасць і кіраванасць усіх працэсаў у краіне для канкурэнцыі з іншымі краінамі і транснацыянальнымі карпарацыямі. Як адзначыў у час выступлення Нурсултан Назарбаеў, «Казахстан — невялікая, у сусветных маштабах, эканоміка. І трэба ёю кіраваць вельмі эфектыўна. Краіна павінна працаваць як адзіная карпарацыя, а дзяржава павінна быць яе ядром. Сіла карпаратыўнага мыслення заключаецца ў тым, што ўсе працэсы разглядаюцца як адзінае цэлае. Дзяржаўныя кіраўнікі ўсіх узроўняў павінны навучыцца такому бізнэс-мысленню».

Улічваючы, што папярэднія рэформы ў Казахстане даказалі сваю эфектыўнасць, а таксама тое, што для ажыццяўлення запланаваных пераўтварэнняў краіна мае вялізныя прыродныя рэсурсы, верагоднасць паспяховай рэалізацыі новай стратэгіі дастаткова высокая. Тым больш што рэалізоўвацца яна будзе і ў новым Еўразійскім эканамічным саюзе, які, як пацвердзіў Прэзідэнт Казахстана, з'яўляецца бліжэйшай мэтай.

**Сяргей КІЗІМА,**
**загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук.**

■ Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАТЫ ПАДТРЫМАЛІ ДЭКРЭТ № 9

**УЧОРА на чарговым пасяджэнні першай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання дэпутаты абмяркоўвалі адно з самых гучных рашэнняў кіраўніка дзяржавы апошняга часу — Дэкрэт № 9 «Аб дадатковых захадах па развіцці дрэваапрацоўчай прамысловасці».**

Дзеянне дэкрэта распаўсюджваецца на 9 прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасці. З работнікамі на гэтых арганізацыях на перыяд рэалізацыі інвестыцыйных праектаў заключаюцца кантракты, якія маюць шэраг асаблівасцяў: скасаванне кантракта па ініцыятыве работніка магчыма толькі па згодзе наймальніка. Пры гэтым работнік мае права абскардзіць адмову наймальніка скасоўваць кантракт у старшыні аблвыканкама або Мінскага гарвыканкама.

Яшчэ адна важная асаблівасць у тэрмінах кантрактаў — яны заключаюцца толькі на час рэалізацыі інвестыцыйнага праекта. Кантракт можа быць скасаваны па згодзе бакоў і на падставе патрабаванняў работніка, якія прадугледжаны 41-м артыкулам Працоўнага кодэкса: інваліднасць, парушэнне заканадаўства аб працы, змена месца жыхарства і іншыя прычыны.

У мэтах матэрыяльнага стымулявання работнікаў у выкананні абумоўленых кантрактам абавязкаў дэкрэт прадугледжвае штомесячныя выплаты ў дадатак да заробку ў памерах, вызначаных наймальнікам. Гэтыя выплаты работнік вымушаны будзе вярнуць у выпадку звальнення з-за парушэння працоўнай дысцыпліны альбо іншых парушэнняў.

«Тыя, хто абвінавачваюць Беларусь у вяртанні да прыгоннага права, не маюць рацыі, — пракаментавала сітуацыю міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна. — Мадэрнізацыя эканомікі ўсім патрэбна. Дзевяці прадпрыемствам дрэваапрацоўчай прамысловасці для гэтай мэты аказана дзяржаўная падтрымка. Рэалізацыя інвестыцыйнага праекта пачалася ў 2008 годзе. Цяпер лічбы: 890 млрд рублёў — дзяржпадтрымкі, 13,5 млрд — адтэрміноўка плацяжоў у фонд сацыяльнай абароны, 27 млрд — рэструктурызацыя пазыкі ў мясцовы і рэспубліканскі бюджэт. У адказ патрабуецца своечасова рэалізаваць інвестпраект. Аднак ход рэалізацыі нездавальняльны: тэрміны будаўніцтва пераносяцца, на прадпрыемствах — бязладдзе. Таму і ўзнік дэкрэт, які прапісвае больш жорсткія патрабаванні, у першую чаргу, да наймальніка. Так, работнікі пераводзяцца на кантракты, але абсалютная большасць супрацоўнікаў на гэтых прадпрыемствах па кантрактнай сістэме працавала і да гэтага. Перавод на кантракты, згодна з дэкрэтам, адбываецца ў парадку і на ўмовах Дэкрэта № 29 ад 1999 года, які ўлічвае ўсе інтарэсы работнікаў».

Інвестпраект на гэтых прадпрыемствах у асноўным заканчваецца ў 2013 годзе, максімальны тэрмін — 2014 год, падкрэсліла Марыяна Шчоткіна. «Асаблівасць дакумента ў тым, што кантракт можа быць заключаны і на 6 месяцаў, і на 20 дзён. І, напэўна, калі працоўны калектыў узяўся праект рэалізоўваць, то трэба давесці справу да канца», — заўважыла міністр.

Штомесячныя выплаты, якія вызначае дэкрэт, не ўключаюцца ў заробак, але пры разліку пенсіі будуць улічвацца, запэўніла высокапастаўлены чыноўнік. Пры скасаванні кантракта па згодзе бакоў (на падставе 41-га артыкула Працоўнага кодэкса) работнік выплаты не вяртае.

За кастрычнік сярэдні заробак па лесаперапрацоўчых прадпрыемствах Беларусі склаў каля 3,5 млн рублёў. «Вядома, гэта няшмат, і штомесячныя выплаты не павінны быць капеечнымі, — лічыць Марыяна Шчоткіна. — Гэтыя выплаты вызначаюцца загадам па прадпрыемстве, і кіраўнік сам вырашае, рабіць іх аднолькавымі альбо дыферэнцаванымі. Адказнасць тут ляжыць на кіраўніках. Гэта правільна і не супярэчыць заканадаўству».

**За час дзеяння інвестыцыйных праектаў з 2008 года па верасень 2012 года дзяржаўная падтрымка дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў склала больш за 890 млрд рублёў.**

У Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, запэўніла яго кіраўнік, ніякіх зваротаў з нагоды такога новаўвядзення не паступала. «Прынамсі, дэкрэт стане штуршком і прымусіць кожнага прааналізаваць ход сваіх інвестпраектаў, — дадала яна. — Сёння абсалютна любую сітуацыю можна паказаць як з добрага, так і з кепскага боку. Самае галоўнае ў дэкрэце — часовы характар. Мадэрнізаваныя прадпрыемствы — гэта высокія заробкі і сацыяльная абароненасць. А гэта важна для кожнага работніка».

На тое, што Дэкрэт № 9 не адмяняе дзеянне 41-га артыкула Працоўнага кодэкса, які рэгулюе права работніка на датэрміновае скасаванне працоўнага дагавора, звярнуў увагу і **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Мікалай САМАСЕЙКА.**

«Акрамя хваробы, інваліднасці і пераезду, яшчэ адна важная падстава для скасавання кантракта — парушэнне наймальнікам Працоўнага кодэкса, калектыўнага або працоўнага дагавору. І ў гэтым выпадку ўжо наймальнік будзе вымушаны выплаціць работніку выхадную дапамогу, — сказаў ён. — Да таго ж дэкрэт не забараняе работніку адмовіцца працягваць кантракт нават да завяршэння рэалізацыі інвестпраекта. І паколькі такі выпадак не будзе з'яўляцца скасаваннем кантракта па ініцыятыве наймальніка, адсутнічаюць юрыдычныя падставы для вяртання атрыманых раней выплат».

Згодна з працоўным заканадаўствам, дадаў парламентарый, максімальны тэрмін дзеяння кантракта — 5 гадоў. І калі работнік не згодны заключыць новы кантракт, сілком зрабіць гэта яго ніхто не прымусіць. Мікалай Самасейка таксама лічыць, што з юрыдычнага пункту погляду дэкрэт цалкам упісваецца ў дзейнае заканадаўства Беларусі.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Аляксандр ЗАЗУЛЯ** выказаў сумненні, наколькі стан у дрэваапрацоўчай галіне адпавядае канстытуцыйным прынцыпам незалежнасці Беларусі і наколькі захавана законнасць у распараджэнні грашовымі сродкамі, якія атрымалі 9 прадпрыемстваў гэтай галіны. «Таму я разумею і падзяляю рэакцыю кіраўніка дзяржавы», — заявіў парламентарый.

Толькі адзін дэпутат прагаласаваў супраць праекта пастановы Палаты прадстаўнікоў аб дэкрэце № 9. Астатнія рашэнне кіраўніка дзяржавы падтрымалі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

# «Дзеці не павінны дзяжурыць на пераходах...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Хацелася б засяродзіць увагу ўсіх на адной акалічнасці: больш за палову дзяцей (14 чалавек), што загінулі, былі пасажырамі і знаходзіліся ў машыне разам са сваімі бацькамі, якія не змаглі забяспечыць іх бяспеку, — падкрэсліла Ганна Банадык. — 9 дзяцей былі пешаходамі. 2 дзіцяці, якія атрымалі смяротныя траўмы, кіравалі веласіпедамі, і 1 непаўналетні сеў за руль транспартнага сродку. Гэта была 15-гадовая дзяўчынка-падлетак... Мы лічым, што для навучання дзяцей бяспечным паводзінам на дарогах было зроблена за апошнія гады вельмі шмат, аднак сёння акрэслілася новая праблема — пешаходныя пераходы, якія не рэгулююцца, у буйных гарадах. Многія кіроўцы прызнаюцца, што калі яны самі селі за руль аўтамабіля, то сталі больш акуратнымі пешаходамі.

Усе ведаюць, што пешаход карыстаецца прыярытэтам на пешаходным пераходзе, але пры гэтым ніхто чамусьці не бярэ пад увагу наступны пункт правілаў: перад выхадам на «зебру» пешаход павінен пераканацца ў бяспечнасці свайго пераходу цераз праезную частку, у тым, што ўсе машыны спыніліся і гатовы яго прапусціць. І гэтую думку трэба абавязкова давесці да кожнага дзіцяці, бо дзеці, выходзячы з пасажырскага транспарту, нярэдка кідаюцца наўскасяк (за 20—30 метраў) да перахода. Прычым далёка не кожны кіроўца можа своечасова ўбачыць гэтых маленькіх пешаходаў з-за іх невялікага росту.

**Удзел у рабоце такога атрада павінен быць, па-першае, добраахвотным, а па-другое, дзеці не павінны выходзіць на дарогу і спыняць сваім целам транспартны паток.**

Сёння ў Беларусі аўтатранспартны парк налічвае 3,5 млн адзінак. Таму бяспечны арэал пражывання для дзяцей звузіўся як ніколі, што, на жаль, і даказала трагедыя ў сталічным мікрараёне «Сухарава», дзе пад калёсамі машыны літаральна побач з ганкам школы загінула дзевяцігадовае дзіця. Гэтая трагедыя скаланула ўсю грамадскасць і прымусіла зусім па-іншаму паглядзець на пытанні бяспекі нашых дзяцей. Праўда, як заўсёды, не абышлося без перагібаў на месцах.

## Стопменам можаш ты не быць

Найбольшая колькасць сігналаў паступілі ў Міністэрства адукацыі ад абураных мінчан. Менавіта ў сталічных установах адукацыі бацькоў пад роспіс знаёмілі з інструкцыяй па навучанні дзяцей бяспечным паводзінам на дарозе і, па меркаванні бацькоў, тым самым перакладвалі на іх адказнасць за бяспеку дзяцей. Бацькам прапаноўвалі здаваць грошы на ўстаноўку шлагбаумаў, агароджу вакол школы, не выпускалі дзяцей у вячэрні час сутак са школы без суправаджэння бацькоў. Бацькі школьнікаў былі незадаволены тым, што да дзяжурстваў каля дарогі пачалі прыцягваць вучняў школ, а педагогі, у сваю чаргу, тым, што цяпер да мноства іх абавязкаў дабавіўся яшчэ адзін — па дзяжурстве на пешаходных пераходах. Затое ўсе цяпер даведаліся пра новае слова «стопмен». Прадстаўнікоў атрадаў стопменаў у часы пік (калі школьнікі ідуць на ўрокі або масава вяртаюцца з заняткаў) сёння ў Мінску можна ўбачыць зранку і ўвечары на нерэгулюемых пераходах...



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Хацелі як лепш, а атрымалася, як заўсёды, — вымушаны канстатаваць **намеснік міністра адукацыі Васіль БУДКЕВІЧ**. — Ідэя стварэння атрадаў стопменаў — добрая і мае права на жыццё. Больш за тое, гэта шырока распаўсюджаная ў многіх краінах практыка. Але ўдзел у рабоце такога атрада павінен быць, па-першае, добраахвотным, а па-другое, дзеці не павінны выходзіць на дарогу і спыняць сваім целам транспартны паток. Іх дзейнасць у атрадзе стопменаў павінна абмяжоўвацца тэрыторыяй школы — прафілактычнай работай і ўзаемадзеяннем з малодшымі школьнікамі. Юныя ж выратавальнікі не прысутнічаюць непасрэдна на пажарах! Усё ж такі клопат аб дзецях — гэта абавязак дарослых! І ўвогуле задача стопмена (педагог гэта будзе ці хто-небудзь з бацькоў) — не перакрываць рух на дарозе, а, стоячы на тратуары і дачакаўшыся, пакуль на пераходзе збяруцца дзеці, спецыяльным знакам прыцягнуць увагу кіроўцаў: маўляў, будзьце, калі ласка, асцярожныя, вы павінны спыніцца. І толькі затым, калі ўсе машыны спыніліся, перавесці дзяцей. Стопмен — гэта фактычна той жа пешаход.

— Паверце, гэта не ініцыятыва ДАІ — прымусіць усіх педагогаў працаваць на не рэгулюемых пераходах, — запэўніла Ганна Банадык. — Так, мы не супраць дапамогі, але не трэба перагінаць палку. Калі можна выключыць прысутнасць дзяцей, то лепш гэта зрабіць. Дарэчы, нашы юныя інспектары дарожнага руху добра ведаюць, дзе трэба стаяць, як стрымліваць аўтатранспартны паток і як дзяцей правільна пераводзіць цераз дарогу. Ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах гэты метад даўно адпрацаваны, і там не ўзнікае праблем. Да апошняга часу не было разумення толькі з боку Камітэта па адукацыі горада Мінска... Затое цяпер стопмены стаяць у сталіцы і на пераходах са святлафорамі, і ў дварах. Незразумела толькі, навошта? Запомніце: такія меры павінны прымацца не ў кожнай школе, а толькі ў школах, якія размешчаны непасрэдна паблізу ад праезнай часткі і на нерэгулюемых пераходах. Для прыкладу, у Брэсцкай вобласці налічваецца ўсяго 86 школ, размешчаных непасрэдна побач з праезнай часткай, дзе няма святлафораў. На нашу думку, да работы ў атрадах стопменаў можна было б прыцягваць валанцёраў — актывістаў БРСМ, курсантаў аўташкол, беспрацоўных, якія знаходзяцца на ўліку на біржы працы, бацькоў, сваякоў школьнікаў.

— А задача кіраўнікоў устаноў адукацыі — паклапаціцца пра тое, каб з дапамогай турнікетаў, штучных перашкод, розных архітэктурных формаў стварыць своеасаблівы калідор у бок бяспечнага руху дзяцей са школы, — дадаў Васіль Будкевіч. — Тэрыторыя школ павінна быць максімальна закрытай і для доступу транспартных сродкаў, і для староннiх грамадзян. Мы павінны стварыць бяспечнае асяроддзе на шляху вучня ад дома да школы. Павінны распрацаваць самы бяспечны маршрут. Бяспечны — неабавязкова самы кароткі, усё можа быць зусім наадварот. І ўсе дзеці павінны ведаць гэты маршрут.

## Не ўсе флікеры аднолькавыя

**Намеснік дырэктара ТАА «Белпрамэнерга», якое спецыялізуецца на выпуску святлоадбівальных элементаў, Уладзімір ПАРФЁНАЎ** расказаў, што пасля трагедыі з мінскім школьнікам назіраўся ўсплёск попыту на іх прадукцыю ў прадпрыемствах гандлю. Замовы ішлі літаральна кожны дзень... Яно і зразумела: цяпер у сталічных школах педагогі кантралююць абавязковую наяўнасць флікераў ва ўсіх дзяцей.

— Але не ўсе флікеры могуць выратаваць жыццё, — папярэдзіў Уладзімір Парфёнаў. — Сіла адбівання святла залежыць ад якасці матэрыялу, і тут існуе шмат тэхнічных нюансаў. У Беларусі дзейнічае стандарт для выпуску святлоадбівальных элементаў. І калі на этыкетцы тавару, які вы набываеце, напісана, што ён адпавядае стандарту, значыць, гэта правільны тавар. Справа ў тым, што розніца каэфіцыента ў адбіванні святла можа адрозніваца ў дзясяткі разоў, а ад гэтага залежыць ваша жыццё. Аўтамабіль, які рухаецца з хуткасцю 90 кіламетраў у гадзіну, праязджае за секунду 26 метраў, значыць, за 3 секунды ён пераадольвае адлегласць у 100 метраў. А сёння ў продажы можна знайсці танную кітайскую прадукцыю, якую нельга ўбачыць нават з адлегласці ў 70 метраў.

Мы праводзілі эксперыменты:

**Калі флікер выконвае ў вас проста ролю значка ці ўпрыгажэння, то наўрад ці ад гэтага вы станеце на дарозе больш заўважным...**

чалавека, пазначанага нашымі святлоадбівальнымі элементамі, відаць на адлегласці 380 метраў пры бліжнім святле і 700 метраў — пры дальнім. Гэтага дастаткова, каб убачыць пешахода і адрэагаваць на яго з'яўленне на дарозе.

Трэба мець на ўвазе, што кіроўца не бачыць пешахода без флікераў нават за 30-40 метраў. Святло фар падае на чалавека, і той можа пры такім святле нават і кніжку пачытаць, але для кіроўцы ён застаецца нябачным.

— Больш за тое, чалавека з флікерамі кіроўца таксама можа не ўбачыць, бо трэба насіць флікеры правільна, — дадала Ганна Банадык. — Святлоадбівальныя элементы абавязкова павінны быць на рукавах. Калі дзіця чапляе флікер на руказак, то трэба вешаць яго за шнурок — шнурок матляецца, і дзіця становіцца бачным здалёк. Падлеткі даволі часта саромеюцца насіць флікеры, таму мы раім ім таксама выкарыстоўваць шнурок. Апошні чапляецца за замок у кішэні, і, калі падлетак выходзіць на пераход, ён можа дастаць з кішэні флікер і падаць такім чынам кіроўцу дадатковы сігнал. Калі флікер чапляецца за сумку, то сумка павінна знаходзіцца ў правай руцэ, калі машыны справа ад вас, і ў левай — калі злева. А калі флікер выконвае ў вас проста ролю значка ці ўпрыгажэння, то наўрад ці ад гэтага вы станеце на дарозе больш заўважным...

Ёсць яшчэ адзін важны сакрэт: стандарту адпавядаюць толькі святлоадбівальныя элементы белага і лімоннага колеру. І гэта таксама трэба ўлічваць, набываючы флікеры свайму дзіцяці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Спорт

# ПЕРШЫ П'ЕДЭСТАЛ СКАРДЗІНЫ І «ЗАЛАТЫ» ЗАПЛЫЎ ГЕРАСІМЕНІ

**Трэці этап Кубка свету па біятлоне для лідара нашай жаночай зборнай, мякка кажучы, не задаўся. Напярэдадні стартаў Дар'я Домрачава прастудзілася і вырашыла прапусціць дзве гонкі. Стан здароўя дазволіў Домрачавай заявіцца на нядзельны масстарт. Але, напэўна, Дар'я была яшчэ не гатова да барацьбы: 9 промахаў на агнявых рубяжах — і толькі 21-е месца.**

Тым не менш падстава для радасці ў беларускіх заўзятараў усё ж такі была. Упершыню **на п'едэстал узнялася Надзея Скардзіна**. Шчаслівым для беларускі стаў спрынт. Як кажуць, сышліся зоркі на небе: і стральба атрымалася ідэальнай, і ход па дыстанцыі быў неблагім. На фініш Надзея прыйшла трэцяй, паказаўшы найлепшы вынік у кар'еры. «Я толькі хацела добра выканаць сваю працу. Вядома, разумела, што калі чыста адстраляюся і пакажу свой максімум на дыстанцыі, то змагу наблізіцца да лідараў. Але пра п'едэстал, шчыра кажучы, не думала. Калі бегла трэці круг, трэнеры сказалі, што я іду другой. І тады зразумела, што магу трапіць у тройку лепшых», — пракаментавала свой поспех Надзея Скардзіна.

Дзякуючы добраму выступленню ў першай палове сезона зараз Надзея займае найвышэйшае для сябе восьмае месца ў генеральнай класіфікацыі. А Дар'я Домрачава пасля стартаў у Славеніі з другога радка перамясцілася на пяты.

На апошнім спаборніцтве ў гэтым годзе **выдатна выступіла і двухразовая алімпійская прызёрка Аляксандра Герасіменя**. У апошні дзень чэмпіянату свету па плаванні ў 25-метровым басейне беларуска першынствавала на дыстанцыі 50 метраў вольным стылем. Трэба адзначыць, што гэта першы залаты медаль Аляксандры на «кароткай вадзе».

А вось **беларускія хакеісты не здолелі** дабрацца да ўзнагарод на міжнародным турніры «Arossa Challenge» ў Швейцарыі. У паядынку за трэцяе месца падапечныя Андрэя Скабелкі прайгралі нарвежцам 1:4.

Галоўны трэнер беларускай зборнай Андрэй Скабелка так ацаніў апошні матч на турніры: «Зразумела, хлопцы стараліся, як маглі. Не атрымалася падтрымліваць хуткасці, прапанаваныя нарвежскай камандай, на працягу ўсяго паядынку. І калі ў абароне збольшага спраўляліся, то ў нападзенні згулялі сапраўды дрэнна. Безумоўна, тут і заслуга саперніка: звычайныя схемы атакі проста не праходзілі. У цэлым, станоўчыя моманты былі, але толькі эпізадычна».

Такім чынам, дэбют Скабелкі на пасту галоўнага трэнера беларускай каманды па хакеі нельга назваць удачным. Але трэба адзначыць, што склад нашай дружыны быў эксперыментальным, і чакаць гучных перамог наўрад ці трэба было. Тым не менш, да старту чарговага чэмпіянату свету застаецца не так шмат часу, а прычын для апасенняў значна больш, чым аптымістычных спадзяванняў.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ЧАЧЭРСКІ ЛЕДЗЯНЫ ДЗЕД ГАРЦУЕ НА КАНІ

**Для ўсіх, хто верыць у цуды, 23 снежня расчыніць дзверы сядзіба «Гасцінны двор Ледзянога Дзеда». Блізкі сваяк Дзеда Мароза пасяліўся ў вёсцы Мяркулавічы Чачэрскага раёна.**

Новы жыхар мае Двор зімовага чараўніцтва, у якім жывуць казачныя героі, — Ліса, Дамавічок Кузя, Разбойнікі, Баба-Яга і іншыя. Гасцей, якія наведаюць сядзібу цудаў, чакае вандроўка на конях па чароўных сцяжынках, дзе ёсць пакой з чароўнымі люстэркамі, куфарам, лавай, якая выконвае запаветныя жаданні... Акрамя таго, Ледзяны Дзед пачастуе наведнікаў гарбатай і аладкамі, а таксама пацешыць традыцыйнымі забавамі — карагодамі ля ёлкі, сустрэчай са Снягуркай і навагоднім тэатралізаваным шоу. У аддзеле культуры Чачэрскага райвыканкама адзначылі, што ў раёне гэта ўжо другі навагодні турысцка-забаўляльны аб'ект.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## НАВАГОДНІЯ СУВЕНІРЫ

**Магілёўскія майстры і рамеснікі прапануюць набыць арыгінальныя падарункі на Новы год і Каляды.**

У абласным цэнтры адкрылася выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці і рамеснага мастацтва. Тут прадаюцца святочныя сувеніры і работы, выкананыя ў самых розных тэхніках: са скуры, бісеру, гліны і воўны. Гэта плеценыя паясы і тэкстыльныя лялькі, мазаікі і бацік, разьба па дрэве і кераміка, вышыўкі, вырабы з саломкі і гэтак далей. Магілёўцаў запрашаюць у выставачную залу на вуліцу Болдзіна і гарантуюць шырокі выбар падарункаў пад ёлку для сваякоў і сяброў — і па прымальных цэнах.

**Ілона ІВАНОВА.**



## У ГОНАР ГЕНЕРАЛА КАЗАКЕВІЧА

**На 12-й заставе Гродзенскай пагранічнай групы, якой прысвоена імя Героя Савецкага Саюза генерал-лейтэнанта Данііла Васільевіча Казакевіча, адкрыта скульптурная кампазіцыя, прысвечаная легендарнаму пагранічніку. Аўтар — скульптар Генадзь Буралкін.**

Паводле інфармацыі прэс-сакратара Гродзенскай пагранічнай групы Сяргея Шумейкі, ва ўрачыстай цырымоніі разам з кіраўнікамі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі і Гродзенскага аблвыканкама ўдзельнічалі і госці з Міншчыны, дзе нарадзіўся Данііл Васільевіч. А права адкрыць скульптурную кампазіцыю было прадастаўлена Ганароваму пагранічніку Рэспублікі Беларусь, палкоўніку ў адстаўцы Рыгору Абелеўскаму і лепшаму пагранічніку 12-й заставы сяржанту Міхаілу Дуровічу. Імянныя заставы — пагранічная гордасць і слава. Увекавечанне ў іх назвах памяці пра баявых таварышаў бярэ пачатак з 20-х гадоў мінулага стагоддзя. У 1926 годзе на беразе ракі Аракс у перастрэлцы з узброенай бандай загінуў пагранічнік Андрэй Бабушкін. Загадам Упраўлення пагранічнай аховы і войскаў Закаўказскага ГПУ яго імя было прысвоена заставе, дзе ён служыў. Сімвалічна, што і Данііл Казакевіч менавіта ў той час узначальваў пагранічную заставу ў Закаўказскай пагранічнай акрузе.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Кватэрнае пытанне

# КАЛІ НА ПАПЕРЫ АДНО...

**Наш дом будаваўся з долевым удзелам, і да канца года яго павінны здаць у эксплуатацыю. Асноўныя работы сапраўды завершаны. Аднак агульная плошча асобных кватэр да квадратнага метра і больш не адпавядае той, што запісана ў дагаворах. Ці павінны па гэтых кватэрах зрабіць пераразлік кошту будаўніцтва?**

**А. Батурын,** *г. Мінск.*

На практыцы, да ўваходжання ў сілу Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 г. № 396 «Аб долевым будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў», у выпадку адхілення фактычнай агульнай плошчы кватэр ад праектнай у дамах, пабудаваных з долевым удзелам грамадзян, пераразлік кошту кватэры не праводзіўся. Гэта не прадугледжвалася і Тыпавым дагаворам аб долевым будаўніцтве жылля, які быў зацверджаны загадам Мінбудархітэктуры ад 24 мая 1999 г. № 136.

З уваходжаннем у сілу з 1 ліпеня 2006 г. Указа № 396 становішча змянілася. У зацверджанай гэтым Указам (з улікам змяненняў і дапаўненняў) форме прыкладнага дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва прадугледжана (падпункт 6.4.4), што забудоўшчык абавязаны прад'явіць дольніку абгрунтаваны разлік-даведку кошту аб'екта долевага будаўніцтва на працягу месяца з дня зацвярджэння камісіяй акта аб прыёмцы дома ў эксплуатацыю.

Пры гэтым, калі фактычная плошча аб'екта долевага будаўніцтва акажацца меншай (большай), чым агавораная ў дагаворы, забудоўшчык праводзіць пераразлік кошту аб'екта долевага будаўніцтва.

**Віктар САВІЦКІ**

**28 декабря 2012 г. в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Костюковичский лесномхоз»**

**Повестка дня:**

1. О приобретении акций ОАО «Костюковичский леспромхоз» на баланс общества.

Местонахождение ОАО «Костюковичский леспромхоз»: 213640, Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Бахарева, 11а.

Место проведения собрания: **213640, Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Бахарева, 11а.**

Время регистрации в день проведения собрания **с 14.30 до 15.00**.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 21.12.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

**Наблюдательный совет.**

*УНП 700160680*

■ Стыхія

## У МІНСКУ НЕ ХАПАЕ ЛЮДЗЕЙ ДЛЯ СВОЕЧАСОВАГА ПРЫБІРАННЯ ВУЛІЦ

**У Мінску не хапае каля 30% ад неабходнай колькасці работнікаў, якія павінны быць заняты ў ачыстцы пешаходных зон і тратуараў. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА заявіў намеснік генеральнага дырэктара па бягучым рамонце «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Анатоль Жамоздзік.**

«Людзей для прыбірання, вядома, не хапае, — канстатаваў ён. — Далёка не кожны згодны ісці на такую працу за прапанаваны заробак». Паводле яго слоў, прыбіральшчык тэрыторыі атрымлівае каля Br3,5-4 млн. Некаторыя з тых, хто працуе доўгі час, атрымліваюць больш.

Анатоль Жамоздзік расказаў, што кожныя суткі ў расчыстцы прыпынкаў грамадскага транспарту, падземных пераходаў і іншых пешаходных зон удзельнічае каля 800 чалавек. Асноўны аб'ём працы прыпадае на ранішні час, але ў цэлым змены доўжацца з 6.00 да 10.00, потым з 14.00 да 18.00. У цэнтральнай частцы горада прыбіральшчыкі працуюць кругласутачна. «Натуральна, на перыферыі сітуацыя больш складаная», — прызнаў спецыяліст.

Ён адзначыў, што паколькі выпала шмат снегу, хацелася б, каб і прадпрыемствы таксама былі заняты ў ачыстцы вуліц. «Усе разлічваюць на камунальныя і дарожныя службы, гэтак жа і грамадзяне. Я не кажу, каб чалавек станавіўся і чысціў снег на прыпынку, але ў двары каля сваёй машыны ён можа гэта зрабіць», — мяркуе Анатоль Жамоздзік.

## МЕДЫКІ РЭКАМЕНДУЮЦЬ ВЫПІВАЦЬ КУБАК ГАРАЧАГА ЧАЮ ЗА ГАДЗІНУ ДА ВЫХАДУ НА ВУЛІЦУ

**У прафілактыцы абмаражэнняў вялікую ролю адыгрывае ўжыванне гарачай ежы і гарбаты, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве аховы здароўя Беларусі.**

Абмаражэнні можна атрымаць не толькі знаходзячыся працяглы час на вуліцы ў марознае надвор'е, але і носячы цесную і вільготную вопратку і абутак. У зімовы час медыкі рэкамендуюць аддаваць перавагу свабоднай, ветра-і вільгаценепранікальнай вопратцы. Непажадана апранаць рэчы, пашытыя з сінтэтычных тканін, важна абараніць пальцы рук, нос, шчокі, вушныя ракавіны — менавіта яны часцей за ўсё падвяргаюцца абмаражэнню.

Істотную ролю ў прафілактыцы абмаражэнняў адыгрываюць гарачыя ежа і чай. Пасля іх прыёму тэмператураканечнасцяў чалавека павышаецца на 6 градусаў і вышэй, прычым адбываецца гэта не адразу, а праз 30-60 хвілін і эфект захоўваецца на працягу некалькіх гадзін. Такім чынам, вельмі важна загадзя рыхтавацца да выхаду ў халоднае надвор'е на вуліцу.

## ПАРЫВЫ ВЫПРАЎЛЯЛІСЯ Ў СЦІСЛЫЯ ТЭРМІНЫ

**За суткі ў сталічнай вобласці на расчыстцы вуліц і дарог было задзейнічана 918 адзінак тэхнікі і больш за 1,3 тысячы чалавек.**

Як распавялі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, у нядзелю парывы электразабеспячэння былі зарэгістраваны ў 17 населеных пунктах 8 раёнаў. Усяго без электраэнергіі заставаўся 641 прыватны дом, чатыры двухпавярховыя дамы (амаль 1,7 тысячы чалавек), школа. Электразабеспячэнне аднаўлялася ў самыя сціслыя тэрміны. Так, з-за аварыйнага адключэння высакавольтнай лініі без святла і цяпла засталіся 46 жыхароў вёскі Русінавічы Мінскага раёна, паколькі ў зону адключэння трапіла кацельня. Паведамленне паступіла ў 10.30, а ўжо ў 11.50 раённыя электрасеткі падключылі яе да перасоўнага дызель-генератара. Тут жа расчысцілі аўтадарогу да месца адключэння, і электразабеспячэнне было адноўлена.

## «ХУТКАЯ» ЗАХРАСЛА Ў СУМЁТАХ

**Работнікі МНС дапамаглі выцягнуць з сумётаў аўтамабіль хуткай медыцынскай дапамогі. У ім знаходзілася цяжкахворая пацыентка.**

Просьба аб дапамозе паступіла каля гадзіны ночы: за 100 метраў ад вёскі Рудня Гарбовіцкая Калінкавіцкага раёна захрасла ў сумётах карэта меддапамогі з пацыентам у цяжкім стане. Вадзіцель «хуткай» не справіўся з кіраваннем, і ў выніку аўтамабіль знесла ў гурбы снегу. Самастойна выехаць з сумётаў ён не змог. Работнікі МНС пры дапамозе лябёдкі выцягнулі аўтамабіль, пасля чаго хворую даставілі ў бальніцу.

**Сяргей РАСОЛЬКА**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.









**Шаноўныя сябры!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2013 года!**

Спадзяёмся бачыць вас сярод нашых чытачоў і падпісчыкаў і ў наступным годзе.

А напярэдадні навагодніх святаў хочам нагадаць вам, што падпіска на «родную газету на роднай мове» можа стаць добрым падарункам родным вам людзям!

| Індэкс/перыяд | | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|---|
| 63850 | (для індывідуальных падпісчыкаў) | 33 000 | 99 000 | 198 000 |
| 63145 | (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 29 700 | 89 100 | 178 200 |
| 63858 | (для ведамасных падпісчыкаў) | 61 000 | 183 000 | 366 000 |
| 63239 | (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 54 900 | 164 700 | 329 400 |

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

# ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 10 (18)

■ І такія служаць!

## У ГОСЦІ ДА ЯРЫ І ЧАРВЭЛА

**Ці ёсць разумнейшая жывёла за сабаку? Напэўна, не. І не толькі таму, што сабака — лепшы сябар чалавека. Гэта і добрыя «спецыялісты», добрасумленнасці і якасці працы якіх можа пазайздросціць кожны з нас. Сабакі-выратавальнікі, сабакі-целаахоўнікі, сабакі-сышчыкі, сабакі-паляўнічыя, сабакі-рамізнікі, сабакі-пастухі, сабакі-павадыры, нават сабакі-лекары...**



Ёсць і сабакі-вайскоўцы, якія разам з салдатамі служаць у войску. Яшчэ ў Старажытным Рыме сабак навучалі ваеннай справе. У Вялікую Айчынную чатырохногія былі разведчыкамі, сувязістамі (працягвалі тэлефонныя кабелі), вызначалі месцазнаходжанне мін, дапамагалі дастаўляць боепрыпасы байцам, якія трапілі ў акружэнне, працавалі санітарамі. Сабакі былі і падрыўнікамі: несучы на сабе выбухоўку, кідаліся пад танкі. У Сталінградскай бітве сабакі спалілі 63 танкі ворага — цэлы танкавы батальён!

Гэтыя здольнасці жывёл цэняцца і сёння. Чатырохногія сябры выконваюць тое, што чалавеку часам не па сілах. Своеасаблівая «армія» і дом для сабак — кіналагічны цэнтр, што ў Калодзішчах. Тут яны жывуць, трэніруюцца, лечацца, нараджаюць новае патомства, адпачываюць... Адсюль трапляюць і на баявыя дзяжурствы.

На днях карэспандэнты «Звязды» завіталі да іх у госці. А канкрэтна — да Яры і Чарвэла.

Яра — усходнееўрапейская аўчарка. Ёй быў амаль год, як гаспадары ад яе адмовіліся. Праўда, шкада было чатырохногага сябра пакідаць без прытулку. Таму вырашылі адвезці ў «дзіцячы дом» — кіналагічны цэнтр. Тут Яры знайшлі «бацьку», які займаецца яе «выхаваннем», якраз паўтара года прайшло з таго часу.

— Як толькі Яру прывезлі, яна была шалёная, скакала на рукі, на галаву, — з усмешкай успамінае **кінолаг, старшына кантрактнай службы Томаш ВЯРЖБІЦКІ.** — Два-тры дні мы прывыкалі адно да аднаго: падоўгу гулялі, лашчыліся, нават размаўлялі. Затым пачаўся працэс навучання. Трэба было вызначыць, ці прыдатны сабака да службы.

Экзамен на прафпрыдатнасць Яра вытрымала на «выдатна». Ужо ў першыя дні знаёмства з Ярай Томаш Вяржбіцкі вызначыў, што сабака падыходзіць для вышуковай дзейнасці. Аўчарка была актыўная, кусалася, гуляла. Пасля некалькіх спецыяльных практыкаванняў стала зразумела, што ў сабакі развіты пошукавыя схільнасці.

— Галоўнае — вызначыць, да якога віду службы ў сабакі ёсць здольнасці, — расказвае **намеснік начальніка цэнтра па ідэалагічнай рабоце, падпалкоўнік Андрэй БАРДУКОЎ.** — Цэнтр спецыялізуецца па падрыхтоўцы сабак для мінна-вышуковай, пошукава-выратавальнай, вышуковай, у тым ліку для вышуку зброі, наркотыкаў і выбуховых рэчываў, каравульнай і патрульнай дзейнасці. Звычайна, ведаючы толькі пароду сабакі, адразу можна сказаць, да чаго яна прыдатная. Напрыклад, каўказскія аўчаркі лічацца вартавымі сабакамі, у лабрадораў добра развітыя навыкі пошуку наркотыкаў і выбуховых рэчываў, нямецкія аўчаркі — найбольш універсальныя «спецыялісты»: яны добрыя выратавальнікі, сышчыкі, прыдатныя для каравульнай і патрульнай дзейнасці.

Сёння Яры два з паловай гады. Аўчарка з Томашам — неразлучныя сябры.

Томаш Вяржбіцкі прыйшоў служыць у кіналагічны цэнтр у 2010 годзе. Пасля таго, як аднойчы на вучэннях сустрэўся з кінолагамі, з'явілася жаданне працаваць з сабакамі. Тым больш, любоў да гэтай жывёлы ў мужчыны асаблівая. Дзесяць гадоў у яго жыла лайка, пасля «выхоўваў» шатландскую аўчарку.

У першыя дні службы ў кіналагічным цэнтры за Томашам Вяржбіцкім замацавалі Максімуса — нямецкую аўчарку. Амаль два гады трэніровак, прагулак і сяброўства — а потым сабаку спісалі, аддалі мясцовым жыхарам. Вядома, сумна было расставацца з чатырохногім сябрам: за гэты час паспелі не толькі дабіцца добрых поспехаў па службе, але і пасябравалі так, што з паўслова разумелі адзін аднаго. Парадокс: людзі, размаўляючы на адной мове, часам не могуць знайсці паразуменне!

— Выхоўваць сабаку — вельмі адказна, — лічыць Андрэй Бардукоў. — Сабака хутчэй можа прызвычаіцца да чалавека, чым ён да яе. Таму змену свайго гаспадара жывёла перажывае з вялікім болем. Можа не есці некалькі дзён, не выконваць службовыя абавязкі. Сабакі, як дзеці, якіх аднялі ў матулі. Вайскоўцы разумеюць гэта. Таму некаторыя з іх дзеля чатырохногіх сяброў застаюцца ў цэнтры на кантрактную службу.

Як у кіналагічнага цэнтра ёсць свой рэжым, так і ў Яры — распарадак дня. У 8.00 да яе прыходзіць гаспадар, які сабаку корміць, прыбірае за ім, выгульвае. У 9.00 пачынаюцца заняткі. Вядома, у адзін дзень выканаць усе прыёмы і заданні проста немагчыма. Таму складаецца спецыяльны графік, дзе плануюцца практыкаванні на бліжэйшы час. Праўда, ёсць элементы агульнага курса, якія праводзяцца

**Чатырохногія сябры выконваюць тое, што чалавеку часам не па сілах. Своеасаблівая «армія» і дом для сабак — кіналагічны цэнтр, што ў Калодзішчах. Тут яны жывуць, трэніруюцца, лечацца, нараджаюць новае патомства, адпачываюць...**

штодзённа: напрыклад, рэакцыя сабакі на каманды. Затым ідуць практыкаванні па спецыяльнай праграме, якая распрацавана менавіта для навучання сабак вышуковага профілю: пошук па следзе, выбіранне пэўнага прадмета ці чалавека...

Адзін са сваіх навыкаў Яра нам прадэманстравала. З кучы пальчатак патрэбна было выбраць толькі тыя, якія належаць яе гаспадару. З задачай справілася на «выдатна»! Заслужыла заахвочванне! Кавалак мяса ці жменя сухога корму, нават пагладжванне або гульня — і сабака гатовы прыступіць да выканання іншых заданняў. Усё як



у людзей: плацяць грошы — добра працуеш, не — навошта марнаваць свой час? Толькі тут усё значна прасцей: можна абысціся прадуктамі ці асабістай увагай.

Гадзіннік паказаў 14.00. Час абеду. Прычым як для Яры, так і для Томаша. Зімой у сабакі трохразовае харчаванне, летам дастаткова паесці два разы на дзень. Дзённы рацыён любой сабакі, незалежна ад пароды, выглядае так: 400 грамаў ялавічыны другой катэгорыі ці каніны, 600 грамаў крупы аўсянай ці сечкі, 300 грамаў гароднiны, 13 грамаў солі і 15 — жывёльнага тлушчу.

Паабедалі! Вядома, у нас з Томашам ежа была іншай. Час абслугоўвання Яры: прыбіранне «доміка», прагулка, вычэсванне. Тое ж самае ў шэсць гадзін вечара. А да гэтага — яшчэ адзін цыкл трэніровак. І сустрэча з сябрам.

Знаёмцеся — Чарвэл. Нямецкая аўчарка. Чатыры гады. Са сваім гаспадаром — Уладзімірам Красоўскім — Чарвэл ужо год як нясе службу. Нялёгка сабаку было прызвычаіцца да новага гаспадара. Не лягчэй было і Уладзіміру: гэта яго першы вопыт працы кінолагам.

— Каб пасябраваць з Чарвэлам, прыходзіў да яго кожны дзень, — прызнаецца салдат тэрміновай службы. — Першыя дні, калі з ім вітаўся, той сядзеў у будцы, нават да мяне не падыходзіў: сумаваў па мінулым гаспадары. Некалькі прагулак, гульняў — і пачаў адказваць на мае прывітанні: кідаўся на мяне, брахаў, лашчыўся.



Сёння і не скажаш, што паміж Уладзімірам і Чарвэлам быў перыяд, калі яны не маглі знайсці агульную мову. Усюды разам! Нават размаўляючы са мной, вайсковец не адпускае сабаку ад сябе ні на крок. Разам — і на патруляванні тэрыторый, на вартаванні аб'ектаў. Неаднойчы ўдзельнічалі ў спецзаданнях, выязджалі на паказальныя выступленні. Ёсць у Чарвэла і ўзнагароды!

На жаль, сяброўства Уладзіміра з Чарвэлам хутка павінна скончыцца: праз паўгода вайсковец адслужыць свой тэрмін. Шкада жывёлу! Зноў будзе сумаваць па гаспадару, зноў трэба будзе прывыкаць да іншага... Праўда, на гэты раз сабаку павінна быць прасцей: Уладзімір плануе яго перадаць роднаму брату, які толькі пачаў службу ў кіналагічным цэнтры. Хто-хто, а гэтая жывёла адчуе блізкую сувязь паміж былым і новым гаспадарамі!

Адчуе, але зразумее, што чалавек не той. Гэта як дзіця замест маці стане гадаваць родная цётка. Трэба разумець, што мы нясём адказнасць за тых, каго прыручылі.

...На дварэ зіма. А Яра і Чарвэл усё з той жа актыўнасцю гуляюць, трэніруюцца. Вядома, жывёлы яны цеплакроўныя. Няўжо і не хварэюць?

— Яны — жывыя істоты, а значыць, схільныя да ўсялякіх змяненняў арганізма, у тым ліку і да хвароб, — патлумачыў **начальнік ветэрынарнага пункта кіналагічнага цэнтра, маёр медыцынскай службы Сяргей ЖЫЗНЕЎСКІ.** — У зімні перыяд сярод захворванняў сабак найбольш распаўсюджана інфекцыйная хвароба — парагрып. Ён характарызуецца сухім кашлем, павышэннем тэмпературы цела. Калі адразу сімптомы выявіць, парагрып лечыцца хутка. Звычайна да гэтага не даходзіць: мы праводзім высакаякасную прафілактыку жывёл. Штогод усе сабакі прывіваюцца ад шматлікіх захворванняў, праводзіцца вітамінізацыя, дэзынсекцыя (апрацоўка сабак у асенне-зімні перыяд ад кляшчоў).

Спадзяёмся, што ўсю зіму Яра і Чарвэл будуць такімі бадзёрымі і жвавымі. Жадаем добрага здароўя і іх гаспадарам. На гэтым развітваемся. Плануем завітаць яшчэ. Чакайце ў госці!

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ**

## ПРЫСЯГНУЛІ НА ВЕРНАСЦЬ РАДЗІМЕ

**У суботу, 15 снежня, у злучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь адбылася ўрачыстая цырымонія прыняцця Ваеннай прысягі новым папаўненнем.**



Фота БЕЛТА.

Па традыцыі, павіншаваць маладых воінаў у злучэнні і воінскія часці прыбылі прадстаўнікі Міністэрства абароны, камандаванняў відаў Узброеных Сіл, мясцовых органаў улады, грамадскіх арганізацый, родныя і блізкія вайскоўцаў.

У гэты дзень словы прысягі вымавілі каля 7 тысяч маладых людзей, прызваных на тэрміновую ваенную службу, і каля 2 тысяч чалавек, прызваных на службу ў рэзерве.

■ Увага — конкурс!

## ПАЛАЖЭННЕ

1. Творчы конкурс на лепшую публікацыю аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь (далей — Узброеныя Сілы), ваенна-патрыятычным выхаванні (далей — конкурс) праводзіцца ў мэтах пашырэння асветніцкай работы сярод дзяцей і падлеткаў аб беларускай арміі, прыцягнення ўвагі моладзі да пытанняў абароны Айчыны, павышэння прэстыжу воінскай службы, садзейнічання развіццю творчага патэнцыялу юных грамадзян Беларусі.

2. Заснавальнікамі конкурсу з'яўляюцца Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь (далей — Міністэрства абароны) і рэдакцыя газеты «Звязда».

3. Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца ўпраўленне інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны і рэдакцыя газеты «Звязда».

4. Конкурс праводзіцца штогод.

5. Для ўдзелу ў конкурсе прымаюцца тэкставыя матэрыялы (заметкі, рэпартажы, артыкулы, нарысы, вершы) і фотаматэрыялы аб мерапрыемствах ваенна-патрыятычнай накіраванасці, аб дзейнасці Узброеных Сіл, аб ветэранах войнаў і Узброеных Сіл, дасланыя ў перыяд з 1 лютага бягучага года па 1 лютага наступнага года.

6. Удзельнікамі конкурсу могуць быць маладыя аўтары ва ўзросце да 18 гадоў.

7. Інфармацыя аб пачатку правядзення конкурсу размяшчаецца на старонках газеты «Звязда» і ў «Белорусской военной газете».

8. Конкурсныя матэрыялы дасылаюцца на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, рэдакцыя газеты «Звязда», e-mail: info@zvyazda.minsk.by (з паметкай «На конкурс»). Кантактны тэлефон (017) 287 18 38.

Аўтар кожнай работы ўказвае сваё імя, прозвішча, узрост, месца вучобы, хатні адрас і кантактны тэлефон. Для налічэння аўтарскага ганарару за апублікаваныя творы неабходна ўказаць пашпартныя звесткі (серыя, нумар, дзе, калі, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар).

9. Дасланыя на конкурс творы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Крытэрыі ацэнкі твораў:

навізна тэм, арыгінальнасць іх раскрыцця;

яркасць і самабытнасць;

дасканаласць мастацкага стылю;

кампазіцыйная цэласнасць твораў?

10. Падвядзенне вынікаў конкурсу праводзіцца штогод на працягу студзеня — лютага наступнага года па намінацыях:

— «За творчасць і арыгінальнасць пры падрыхтоўцы публікацыі»

— «Спыніся, імгненне!» (за майстэрства фотарэпартажу).

11. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі і памятнымі падарункамі.

12. Найбольш актыўныя ўдзельнікі конкурсу, якія не сталі пераможцамі, па рашэнні журы могуць быць узнагароджаны граматамі.

13. Падвядзенне вынікаў конкурсу ажыццяўляецца журы, у склад якога ўваходзяць супрацоўнікі ўпраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь і рэдакцыі газеты «Звязда».

14. Узнагароджанне пераможцаў конкурсу праводзіцца штогод ва ўрачыстых абставінах напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

*Спадзяёмся, што конкурс дапаможа газеце і яе чытачам адкрыць для сябе новых аўтараў і пазнаёміцца з цікавымі і незвычайнымі героямі іх публікацый. А вам, тым, хто вырашыць удзельнічаць, — праверыць і адкрыць свае творчыя здольнасці. Тым больш у такой важнай тэме, як ваенна-патрыятычная. Якая ў нашай краіне заўсёды адна з самых надзённых.*

*Давайце пісаць гэтую гісторыю разам. Патрыятычную гісторыю вашага краю і лёсаў вашых незвычайных землякоў.*

*Шукайце сваю тэму і смела пішыце. Вашы лісты, артыкулы, нататкі, нарысы, рэпартажы, замалёўкі — усё можа стаць новымі цікавымі старонкамі нашай агульнай і багатай на падзеі гісторыі.*

*Далучайцеся да конкурсу!*

■ Тэст-драйв па-армейску!

## З ВІРТУАЛЬНАГА ТАНКА Ў РЭАЛЬНЫ

**Турнір папулярнай шматкарыстальніцкай гульні «Свет танкаў» упершыню прайшоў у кастрычніку гэтага года. Для каманды «WOT NOOBS», якая стала яго пераможцай, быў абвешчаны галоўны прыз ад Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь — права прайсці аднадзённы азнаямленчы курс падрыхтоўкі па ваджэнні танка Т-72 на базе 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра (АВЦ). І вось надышоў час практычна рэалізаваць гэтую магчымасць.**

У складзе каманды-пераможцы — самыя актыўныя і таленавітыя геймеры з розных гарадоў краіны. Многія з іх адслужылі ў войску, працуюць у розных сферах вытворчасці. На працягу некалькіх гадоў запар людзей розных прафесій і ўзростаў (ад 20 да 30 гадоў) аб'ядноўвае адно захапленне: у вольны ад заняткаў і працы час яны вядуць сур'ёзныя бітвы ў гульні «Свет танкаў» і ўжо дабіліся ў гэтым камп'ютарным «відзе спорту» ўсеагульнага прызнання.

Удзельнікі каманды атрымалі ўнікальную магчымасць пасля віртуальнага танка перасесці ў рэальны, каб на сабе адчуць, што значыць кіраваць сапраўднай баявой машынай.

Як і належыць, асваенне танка Т-72 для навічкоў пачалося з тэорыі. У спецыяльным вучэбным класе вопытны выкладчык цыкла ваджэння і тэхнічнай падрыхтоўкі, падпалкоўнік запасу Юрый Мацвееў давёў да пачаткоўцаў-«танкістаў» агульнае абсталяванне баявой машыны і аддзялення кіравання, нагляднa выкарыстоўваючы для гэтага макет танка.

У хуткім часе госці пераехалі ў вучэбны корпус трэнажораў, дзе прайшоў іх чарговы этап паскоранага курса падрыхтоўкі. Каля дзвюх гадзін правялі яны ў ролі вучняў за рычагамі сучаснага электроннага комплексу ТТВ-172М, прызначанага для атрымання навыкаў кіравання Т-72 пры ваджэнні па перасечанай мясцовасці, у складаных умовах надвор'я, рознай пары года і сутак без расходу мотарэсурсаў баявых машын. Менавіта гэты трэнажор дапамагае сённяшнім пачынаючым механікам-кіроўцам у кароткія тэрміны якасна асвоіць «жывую» тэхніку. Прычым зэканоміўшы пры гэтым немалыя дзяржаўныя грошы.

Трэба адзначыць, што курсанты АВЦ асвойваюць вайсковую спецыяльнасць на працягу чатырох месяцаў. Гасцям жа на гэта быў адведзены ўсяго адзін няпоўны дзень. Ці справяцца?..

Зразумела, не абышлося і без памылак. У адных навучэнцаў не атрымалася з першага разу запусціць рухавік і ўстанавіць правільна халастыя абароты, у выніку чаго электронны танк глухнуў адразу ж на «зыходнай». Іншым давялося добра папацець (у прамым сэнсе слова), каб пры хуткасным руху машыны па трасе віртуальнага танкадрома не збіць абмежавальныя слупы або не ўляцець у глыбокую яму.

«Цуда-тэхніка», па чарзе прымаючы «наезнікаў», фіксавала памылкі навучэнцаў падчас ваджэння танка па віртуальнай трасе, выстаўляючы пасля выканання пачатковага практыкавання заслужаную адзнаку. Больш аб'ектыўнага кантралёра проста не знайсці.

— Не чакала, што танкавы трэнажор можа быць такім «жывым», — прызналася журналіст агенцтва «Інтэрфакс» Алена Крашэўская. — Электронная тэхніка як у рэальнасці рэагуе на няроўнасці мясцовасці, для пераадолення розных перашкод неабходна пераключацца, каб машына не заглухла. Я ваджу аўтамабіль з аўтаматычнай каробкай перадач. Тут жа давялося зноў узгадаць, як гэта рабіць механічна. А наогул здорава, што ў беларускім войску ёсць такія электронныя «настаўнікі», якія дапамагаюць танкістам у кароткія тэрміны асвоіць ваенную тэхніку.

Атрымаўшы пэўныя навыкі на электронным трэнажоры пад кіраўніцтвам вопытнага выкладчыка афіцэра запасу Анатоля Пашко, усе навучэнцы атрымалі допуск да самастойнага ваджэння баявога танка. І цяпер на танкадроме ў рэальнасці ім трэба было ўтаймаваць 45-тоннага «жалезнага каня».

Праўда, каб паскорыць працэс ваджэння, была ўлічана нявопытнасць усіх навучэнцаў — рухавік баявой машыны не



Удзельнікі мерапрыемства праходзяць паскораны курс падрыхтоўкі танкістаў-пачаткоўцаў у 72-м гвардзейскім аб'яднаным вучэбным цэнтры.



глушылі. Першым выклікаўся выканаць практыкаванне Юрый Жукоўскі. Надзеўшы танкавы шлем і ўладкаваўшыся за рычагамі кіравання ўжо заведзенага танка, «першапраходзец» з Мінска выйшаў у сувязь з інструктарам па ваджэнні. Як высветлілася пазней, Юрый у свой час тэрміновую служыў у разведвальным батальёне. Адчувалася, што нават бывалы воін хвалюецца: кіраваць танкам яму яшчэ не даводзілася.

Праз хвіліну інструктар даў «дабро» на пачатак ваджэння. Механік-кіроўца, як вучылі, падаў сігнал, «зняў» горны тормаз, уключыў першую перадачу і плаўна апусціў галоўны фрыкцыён. Танк, выкінуўшы клубы шызага дыму, паслухмяна крануўся з месца, пераломваючы гусеніцамі размоклую ад дажджоў зямлю. Над палігонам павіс гром апладысментаў.

Жукоўскі павялічыў абароты танкавага рухавіка і перайшоў на другую перадачу... Цяжкую кіламетровую трасу «першапраходзец» пераадолеў практычна без заўваг.

— Ваджэнне сапраўднага танка пакінула незабыўнае ўражанне, — прызнаўся пазней Юрый. — Адчуваецца, што кіруеш магутным стальным монстрам. Дух займае, калі шматтонная грамадзіна паслухмяная ў маіх руках. Нягледзячы на 45-тонную вагу, баявая машына лёгкая ў кіраванні, манеўраная, хуткасная. Дзякуй арганізатарам за добрую порцыю адрэналіну! Шкада толькі, што маршрут аказаўся малаваты — уволю не пакатаўся.

Варта дадаць, што нароўні з мужчынамі паспяхова прайшлі тэст-драйв баявога танка і прадстаўніцы жаночага полу Наталля Назаранка і Алена Крашэўская. Вытанчаныя дзяўчаты з агенцтва «Інтэрфакс» паказалі сябе сапраўднымі смельчакамі за рычагамі шматтоннай грамадзіны.

Пасля заканчэння вучэбнага занятку ўдзельнікі мерапрыемства падзяліліся ўражаннямі.

**Максім КАЛЯГА, лідар каманды-пераможцы камп'ютарнай гульні «Свет танкаў»:**

— Атрымаў шмат задавальнення ад урокаў ваджэння баявога танка, які спачатку сваімі габарытамі і магутнасцю выклікаў псіхалагічную боязь. Вадзіць сапраўдную баявую машыну аказалася нашмат складаней, чым кіраваць танкам віртуальна. Гэта не проста стукаць па клавіятуры. Час, праведзены ў вучэбным цэнтры, патрачаны недарма.

**Юрый КАСТУЗІК, геймер:**

— Пабываўшы ў Пячах, міжвольна ўспомніў армейскую службу ў войсках сувязі, дзе вадзіў «Урал-375». Ваенны аўтамабіль з баявым танкам не параўнаць.

**Аляксей КУХНЯЦОЎ, адзін з распрацоўшчыкаў камп'ютарнай гульні «Свет танкаў»:**

— Аднадзённая экскурсія ў армейскую «вучэбку» пайшла толькі на карысць пераможцам рэспубліканскага турніру і адыграе станоўчую ролю ў спаборніцтвах сусветнага ўзроўню. У папулярнай камп'ютарнай гульні «Свет танкаў» вельмі важна цеснае ўзаемадзеянне ўсіх членаў каманды. Паездка дала магчымасць хлопцам не толькі адчуць сябе ў ролі сапраўдных танкістаў, але і лішні раз сустрэцца, пакантактаваць адзін з адным, паверыць у свае сілы...

Беларускія распрацоўшчыкі шматкарыстальніцкай гульні «Свет танкаў» у бліжэйшы час маюць намер абсталяваць у 72-м гвардзейскім вучэбным цэнтры камп'ютарны клас з выхадам у інтэрнэт. Добры падарунак для курсантаў «вучэбкі»!

**Мікалай МАКАРЭВІЧ,**
**фота аўтара**

# ДЛЯ ЗДАРОЎЯ МАЛЫХ І ДАРОСЛЫХ



**У мінулую суботу беласнежны пейзаж Цэнтральнага дзіцячага парку імя М. Горкага ў Мінску стракацеў рознакаляровымі сцяжкамі, транспарантамі. Плошчу вакол навагодняй ёлкі запоўнілі гаманлівыя чародкі дзятвы з лыжамі, санкамі. Тут апоўдні пачалося спартыўнае свята сяброўства і здароўя.**




Калі на алеях парку быў дадзены старт зімнім спаборніцтвам, пра гэты дзіцячы фэст нам распавёў намеснік главы адміністрацыі Партызанскага раёна Мінска Уладзімір Зубрык:

— Паглядзіце, колькі дзятвы са школ, інтэрнатаў, гімназій нашага раёна сабралося тут! Разам з настаўнікамі яны прыйшлі не толькі прыняць удзел у зімніх гульнях, але і паспаборнічаць за перамогу. Лыжныя гонкі, перацягванне каната, гонкі на санках, футбол на снезе нікому не дадуць замерзнуць. Неспрыяльным надвор'е аказалася толькі для тых, хто збіраўся ляпіць снегавікоў: не лепіцца снег у такі лёгкі марозец. Гэтае свята мы арганізавалі згодна з праграмай шостага школьнага дня. Няхай вольны ад заняткаў час прыбавіць кожнаму здароўя, паспрыяе сяброўству. Дарэчы, папулярызацыя спорту — гэта зусім не разавае мерапрыемства. Напрыклад, учора ў некаторых школах раёна адбыліся сустрэчы з нашымі алімпійскімі чэмпіёнамі. Сёння, акрамя зімовага свята ў парку, юныя аматары спартыўных гульняў могуць наведаць школьныя спартзалы.

Трэба дадаць, што 15 снежня дадало здароўя не толькі дзецям, але і некаторым дарослым: гэты дзень абвешчаны днём без алкаголю. Многія магазіны рознічнага гандлю прыпынілі продаж алкагольных, слабаалкагольных напояў і піва. Гэта адбылося ў межах рэспубліканскай акцыі «Прафілактыка і ты», мэта якой — прапагандаваць здаровы лад жыцця.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**





**На здымках — фрагменты свята ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага.**

*Зборная мінскай школы № 183 выдатна выступіла ў намінацыі «Маляванне на снезе».*

*Свята адкрывае намеснік главы адміністрацыі Партызанскага раёна Мінска Уладзімір Зубрык.*

*Лыжныя гонкі на алеях парку.*

*Весела імчаліся з горак малыя і дарослыя.*

■ Зоркі гавораць

# Астралагічныя тэндэнцыі года Змяі: удача ўсміхнецца творцам

**Новы год ужо не за гарамі: усюды адчуваецца яго надыход. Пра тое, чаго ж нам чакаць ад года Змяі па ўсходнім календары і для каго ён будзе спрыяльным, расказаў у прэс-цэнтры астролаг Ігар Кірушын. Лічыцца, што надыходны год звязаны з мудрасцю, інтэлектам, з неабходнасцю прымаць важныя лёсаносныя і стратэгічныя рашэнні. Таму пажадана дзейнічаць пад дэвізам «Сем раз адмерай і адзін раз адрэж». Але і прымаць рашэнні будзе лягчэй, чым гэта было раней...**

Паводле слоў спадара Кірушына, год будзе багаты на незвычайныя рашэнні. Варта чакаць сур'ёзных кніг, магчыма, новых адкрыццяў. Надыходны год звязаны з развіццём бізнэсу, навукі, мастацтва, таму асабліва плённым ён можа стаць для людзей творчых і таленавітых.

Паколькі Змяя скідае сваю скуру, то варта задумацца над тым, каб змяніцца ў лепшы бок. Можна пачаць нават з дробязяў — такіх, як змена гардэробу. Можна асвоіць новую прафесію, уступіць у шлюб альбо проста заняцца самаразвіццём, выкарыстоўваючы ўвесь свой патэнцыял. Непасрэдна для тых, хто нарадзіўся пад знакам Змяі, год дасць магчымасць завяршыць усе праекты, распачатыя раней, будзь тое напісанне кнігі ці запуск уласнай справы. Гэта будзе год вынікаў, да якіх, магчыма, Змеі ішлі не адзін год.

У цэлым жа год будзе спрыяльны для кожнага астралагічнага знака, але ў рознай ступені. Найбольш паспяховым ён стане для **Ракаў** і **Блізнят**. Апошніх чакае прыбытак, вандроўка за мяжу, з'явяцца новыя перспектывы ў працы. Але будзе і момант, калі патрэбна будзе зрабіць выбар, які ў будучым паўплывае на многія рэчы. Ракаў першае паўгоддзе «ўзнагародзіць» лішнімі спакусамі, фінансавымі выдаткамі і непатрэбнымі сваркамі, таму варта быць вельмі асцярожнымі ў гэтыя месяцы. А потым у іх таксама з'явіцца магчымасць выбіраць. Не выключана, што гэта прывядзе да поспеху.

Для астатніх знакаў зоркі абяцаюць наступныя агульныя тэндэнцыі будучага ...

**Авенам** можна смела спрабаваць сябе ў вучобе, творчасці. Нават калі з'явіцца жаданне атрымаць правы кіроўцы, то варта гэта зрабіць. Але ўсе рашэнні трэба прымаць прадумана, а не інтуітыўна. Лета-восень спрыяльныя для хатніх спраў, звязаных з будаўнічымі і рамонтнымі работамі. **Цяльцоў** чакае шчасце ў сям'і і поспех у хатніх справах. Магчымыя прыбыткі. Калі яны вырашаць сесці на дыету, то змогуць дасягнуць поспехаў у гэтай справе. **Львы** першую палову года будуць паспяховымі ў каханні, у працы. Вось другое паўгоддзе запатрабуе больш працаваць, бо з'явяцца вялікія выдаткі. Па-свойму спрыяльным будзе год і для **Дзеў**, якія сутыкнуцца з перашкодамі ў працы, можа, нават пачнуць стамляцца ад яе. Але іх чакае сустрэча з уплывовым чалавекам, таму недзе ў другой палове года ўсё задуманае здзейсніцца. **Шалі** будуць



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

паспяховымі ў першым паўгоддзі як у духоўным, так і ў матэрыяльным плане, верагодна, нават, іх чакае падарожжа. А вось потым трэба будзе шмат працаваць, нават не чакаючы прызнання. **Скарпіёнам** варта з пачатку года быць дысцыплінаванымі, бо з-за гэтага могуць узнікнуць непаразуменні з начальствам, а таксама будзе недахоп грошай. Але другая палова будзе больш паспяховай, што дазволіць вырашыць усе праблемы і нават выправіцца ў вандроўку. **Стральцам** зоркі паспрыяюць у пашырэнні бізнэсу і заключэнні кантрактаў, а таксама ў стварэнні сям'і. А потым спатрэбіцца дысцыпліна, каб не ўзнікла непаразуменняў з кіраўніцтвам. **Казярогаў** у пачатку года будуць акружаць канкурэнты ў працы і ў асабістым жыцці, а потым іх чакае падпісанне важнага кантракта. **Вадалеяў** можа чакаць лёсаноснае спатканне з уплывовай асобай, а таксама поспех у стасунках з дзецьмі. Другая ж палова года не такая аптымістычная — амаль што адна руціна і ніякіх перспектыў. **Рыб** чакаюць хатнія справы, магчымы рамонт ці пакупка аўтамабіля. Будуць поспехі ў вучобе, працы і розных творчых пачынаннях.

Астролаг таксама паведаміў, што год Змяі мае тры перыяды, на якія таксама варта звяртаць увагу. ***З 23 лютага па 17 сакавіка*** не рэкамендуецца пачынаць новыя справы. Не пажадана набываць новую тэхніку, праводзіць важныя перагаворы, высвятляць адносіны. Пры гэтым магчыма вяртанне старых сяброў і сувязяў. Такімі ж будуць яшчэ перыяды ***з 26 ліпеня па 20 жніўня і з 21 кастрычніка па 10 лістапада***. Гэта неспрыяльныя дні для распачынання спраў, якія будуць мець дачыненне да вучобы, працы, нават літаратурнай дзейнасці.

Самымі спрыяльнымі будуць люты і жнівень. У лютым (да 23) без рызыкі можна шукаць новыя рашэнні, імкнуцца да нейкіх рэформаў. Жнівень дасць людзям своеасаблівую абарону, якая ў аснове сваёй запатрабуе больш адпачываць ці пакласці пачатак нечаму, што дасць перспектыву надалей. Май будзе ў пэўным сэнсе разбуральным, таму не рэкамендуецца нічога пачынаць і прымаць нейкія рашэнні. Такімі ж тэндэнцыямі характарызуецца і канец кастрычніка—пачатак лістапада. Гэтыя перыяды могуць прынесці рознага кшталту перавароты, таму варта пачакаць з планамі.

Прагнозы зрабіў і незвычайны госць — пітон Фараон, які разам са сваёй гаспадыняй — артысткай Белдзяржцырка — завітаў на сустрэчу. Ён пазіраваў фатографам, забаўляўся з мікрафонам, а потым выбраў запіскі, на якіх былі наступныя прадказанні: «Поспехі Беларусі ў сферы кіно будуць такімі значнымі, што за фільмы мы атрымаем не адзін «Оскар». А ўраджай бульбы дазволіць абменьваць яе на нафту і газ», «Уздым беларускай эканомікі будзе такім, што паглядзець на яго з'едуцца вучоныя з усяго свету. А поспехі БАТЭ будуць такімі грандыёзнымі, што гуляць у барысаўскую каманду прыедуць Раналда і Месі». Што ж, калі змеі і праўда здольныя бачыць скрытае і лічацца мудрымі, то застаецца толькі дачакацца новага года, каб праверыць гэтыя прагнозы.

**Алена ДРАПКО**

Даты | Падзеі | Людзі

**1903** год — нарадзілася (горад Тбілісі) Тамара Цулукідзэ, беларуская пісьменніца, заслужаная артыстка Грузінскай ССР (1934). Літаратурнай дзейнасцю пачала займацца ў 1933 годзе. Выступала ў грузінскім друку з артыкуламі па тэатральных праблемах, з рэцэнзіямі на спектаклі. Пасля таго, як быў арыштаваны і расстраляны яе муж С. Ахметэлі, вымушана была пакінуць тэатр. Арыштавана ў 1936-годзе як жонка ворага народа. Дзесяць гадоў правяла ў турмах, лагерах, на лесапавалах, працавала санітаркай, медсястрой у Краснаярскім краі. З 1943 года знаходзілася ў Комі АССР; арганізавала там тэатр лялек. Зноў арыштавана ў 1950-м. У абаканскай ссылцы пазнаёмілася з беларускім пісьменнікам А. Пальчэўскім, які таксама быў рэпрэсаваны, стала яго жонкай. З 1959-га жыве ў Мінску, з таго ж года выступае ў беларускім друку. Яна вывучыла нашу мову, пісала на ёй дзіцячыя п'есы і апавяданні, шмат перакладала з грузінскай на беларускую і наадварот. Прапагандавала ў Грузіі беларускае мастацтва, а ў Беларусі — грузінскае. Памерла ў 1991 годзе.

**1925** год — у Маскве адкрыўся XIV з'езд партыі, які перайменаваў яе з РКП (б) у ВКП (б) — з Расійскай на Усесаюзную. Колькасць членаў партыі на той момант складала каля 6 млн чалавек. З'езд адкрыў А.І. Рыкаў, які стаў пасля смерці Леніна старшынёй Саўнаркама. Адзін з ключавых момантаў з'езда — разгром Сталіным «новай апазіцыі» Зіноўева — Каменева. У сталінскай гістарыяграфіі XIV з'езд таксама лічыцца «з'ездам індустрыялізацыі». Разам з тым, з'езд не вызначыў канкрэтнага механізму і тэмпаў індустрыялізацыі, абмежаваўшыся толькі пастаноўкай задач агульнага характару: ператварэнне краіны, якая ўвозіць машыны і абсталяванне ў краіну, што вырабляе іх, дасягненне эканамічнай незалежнасці. У палітычнай справаздачы з'езда Сталін каментаваў таксама адмену «сухога закона»: «Два словы аб адной з крыніц рэзерву — пра гарэлку. Ёсць людзі, якія думаюць, што можна будаваць сацыялізм у белых пальчатках. Гэта найгрубейшая памылка, таварышы. Калі ў нас няма пазык, калі мы бедныя на капіталы і калі, акрамя таго, не можам пайсці ў кабалу да заходнееўрапейскіх капіталістаў, не можам прыняць тых кабальных канцэсій, якія нам прапаноўваюць і якія мы адкінулі, — то застаецца адно: шукаць крыніцы ў іншых галінах... Тут трэба выбіраць паміж кабалой і гарэлкай»...



**1941** год — нарадзіўся Анатоль Іларыёнавіч Гардзіенка, беларускі вучоны ў галіне тэхналогіі матэрыялаў, акадэмік НАН Беларусі (2003). Аўтар каля 230 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій, 49 вынаходстваў. Навуковыя даследаванні ў галіне тэорыі і тэхналогіі хуткаснай тэрмічнай апрацоўкі металічных матэрыялаў, металафізікі хуткапрацякальных працэсаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988).

Было сказана

**Арцём Вярыга-Дарэўскі (1816—1884), паэт, драматург, публіцыст і даследчык фальклору, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры:**

*«У змаганні з цяжкасцямі дух вырастае».*

СКЛАЎ ІОСІФ КАРПЫЗА, *г. Ляхавічы*



# «Блакітны скарб Беларусі»

**Па гарызанталі: 2.** Адна з буйнейшых рэк Беларусі. **5.** Азёрны заказнік рэспубліканскага значэння на Віцебшчыне. **10.** Возера ў Бярозаўскім раёне, выкарыстоўваецца як ахаладжальнік ДЭС і служыць эксперыментальнай базай па развядзенні крыветак. **11.** Прыродная вобласць пашырэння пэўнага віду жывёл, раслін. **12.** Сажалкавая рыбная гаспадарка ў пойме Ясельды. **14.** Неабсяжная прастора. **17.** Пеўчая птушка атрада вераб'інападобных, адна з самых шматлікіх на Беларусі. **19.** Прыток Бярэзіны. што ў ліку нямногіх беларускіх мясцін, дзе водзіцца стронга ручаёвая. **20.** Геабатанік, адзін з першых даследчыкаў раслінасці Палесся. **24**. Санаторый у Ваўкавыскім раёне, на беразе аднайменнай ракі. **25.** Спартыўна-турыстычнае двухкорпуснае судна. **26.** Рыбацкі суп. **29.** Рыба сямейства ласасёвых, зрэдку трапляецца ў басейнах Буга, Заходняй Дзвіны, Нёмана. **30**. Паўкустовая ягадная расліна, што ўтварае непралазныя зараснікі па берагах рэк, на заліўных лугах. **31**. Беларускі класік, аўтар верша «Нёман». **32**. Збудаванне на вадаёме для захоўвання спартыўных суднаў. 33. Возера на мяжы з Латвіяй, дзе жывуць рэлікты ледавіковага перыяду, занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі. **37**. Азёрная ўпадзіна. **40**. Ледзяныя ўтварэнні на рэках і азёрах. **43**. Від воднага спорту. **45**. «Чырвоная ...» — сістэматызаваны спіс ахоўных жывёл і раслін. **46**. Надзейны памочнік у паляванні на вадаплаўную дзічыну. **52**. Возера ў Лепельскім раёне. **53**. Водная расліна, што часам пакрывае ўсю паверхню возера, сажалкі, старыцы. **54**. Месца начлегу турыстаў. **55**. Прыток Нёмана, на якім створана буйное вадасховішча для падтрымання рэжыму Свіслачы. **56**. Курортная жамчужына Беларусі. **57**. Пара сутак — найлепшы час для палявання і рыбалкі.

**Па вертыкалі: 1.** Лом з драўляным дзяржаннем для прабівання лёду. **3**. Возера на турысцкім маршруце, што праходзіць па Браслаўшчыне **4**. Чыгунная труба, да якой канатамі прымацоўваецца судна падчас стаянкі. **6**. Горад на Дняпры. **7**. Пасяджэнне па ахове навакольнага асяроддзя, што адбылося ў Жэневе ў 1979 годзе. **9.** Падводная расліна, занесеная ў спіс ахоўных, трапляецца ў азёрах, старыцах і рэках басейнаў Дняпра, Сожа, Прыпяці. **13**. Возера ў Гарадоцкім раёне, у залівах якога расце рэдкі ахоўны від — вадзяны арэх. **14**. Балотная трава. **15**. Ландшафтны заказнік на Гродзеншчыне. **16**. Мастак В. Цвірка як стваральнік карціны «Нёман». **18**. Доўгі шост плытагона. **21**. Штучная насадка для рыбалкі. **22**. Вадасховішча, створанае ў 1967 г. непадалёку ад г. п. Узда для абваднення і рыбалоўлі. **23**. Звод правілаў Воднага кодэкса Беларусі. **27**. Павойная расліна, што часта трапляецца па берагах рэк. **28**. Вадзяны арэх. **31**. Вадаплаўная птушка — традыцыйны аб'ект палявання. **33**. Ланцуг невысокіх узгоркаў на тэрыторыях ландшафтнага заказніка «Асвейскі». **34**. Горад над Заходнім Бугам, рачны порт. **35**. Ён і Агінскі, і Аўгустоўскі, і Днепра-Бугскі. **38**. Адтуліна ў лёдзе для рыбалкі. **39**. Рыба з цыліндрычным, змеепадобным целам, сустракаецца ў басейнах Нёмана, Заходняй Дзвіны і Буга. **41**. Невялікі рачны заліў. **42**. Меліярацыйнае рэчышча. **44**. Расліна сямейства бабовых, зерне якой — добрая прынада для рыбы. **47**. Невялікая балотная птушка з доўгімі нагамі і дзюбай. **49**. Доўгая вузкая мель, якая ідзе ад берага. **50**. Возера ва Ушацкім раёне.

**Па дугах: 2**. Вялікая ўпадзіна ў рачной пойме. **8**. Права на часовае карыстанне вадаёмам у гаспадарчых мэтах. **48**. Птушка атрада гусепадобных, на Беларусі трапляецца падчас асенняга пералёту. **51**. Травяністая расліна, што расце каля ручаёў, крыніц, як рэдкі рэліктавы від занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 2. Днепр. 5. «Сосна». 10. Белае. 11. Арэал. 12. «Сялец». 14. Абшар. 17. Зяблік. 19. Іслач. 20. Адамаў. 24. «Рось». 25. Катамаран. 26. Юшка. 29. Кумжа. 30. Ажына. 31. Колас. 32. Элінг. 36. Рыпы. 37. Катлавіна. 40. Сала. 43. Слалам. 45. Кніга. 46. Сабака. 52. Окана. 53. Раска. 54. Бівак. 55. Вілія. 56. Нарач. 57. Ранак. **Па вертыкалі:** 1. Пешня. 3. Несціш. 4. Паля. 6. Орша. 7. Нарада. 9. Наяда. 13. Цёста. 14. Асака. 15. «Азёры». 16. Аўтар. 18. Бусак. 21. Мушка. 22. Лашанскае. 23. Палажэнне. 27. Хмель. 28. Чылім. 31. Качка. 33. Града. 34. Брэст. 35. Канал. 38. Лунка. 39. Вугор. 41. Затока. 42. Канава. 44. Лубін. 47. Кулік. 49. Каса. 50. Ясна. **Па дугах:** 2. Даліна. 8. Арэнда. 48. Турпан. 51. Лунік.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.25 | 16.48 | 7.23 |
| Віцебск | — 9.22 | 16.30 | 7.08 |
| Магілёў | — 9.15 | 16.38 | 7.23 |
| Гомель | — 9.03 | 16.43 | 7.40 |
| Гродна | — 9.38 | 17.05 | 7.27 |
| Брэст | — 9.30 | 17.14 | 7.44 |

## Месяц

***Першая квадра 20 снежня. Месяц у сузор'і Рыб.***

## Імяніны

***Пр.** Генадзя, Захара, Савы, Сяргея.*
***К.** Ларысы, Багуслава, Віктара, Грацыяна, Паўла.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Учора змяшаў каньяк «Напалеон» з каньяком «Кутузаў».

Назаўтра адчуў увесь цяжар вайны 1812 года.

**Адэса, сямейная пара перад сном.**

**— Фіма! Я тут у газеце прачытаў, што 2012 год перажывуць толькі тыя знакі задыяка, у якіх ёсць рогі, — Авены, Цяльцы, Казярогі! А я ж Скарпіён. Што ж рабіць будзем, Фімачка?!**

**— Сёма, не ствараЙ мітусні... Усё, што змагла, я ўжо зрабіла. Жыць будзеш доўга і шчасліва!**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 26.325. Індэкс 63850. Зак. № 5795.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 снежня 2012 года.